# Еўропа ў 12 уроках



Паскаль Фантэйн,
былы памочнік Жана Манэ,
прафесар Інстытута палітычных даследаванняў, Парыж

Ілюстрацыі Марыо Рамаса

# Змест


1 Навошта патрэбны Еўрапейскі саюз? ........................................1

2 Этапы гісторыі ........................................................................2

3 Пашырэнне .............................................................................11

4 Як працуе саюз? .....................................................................15

5 Задачы саюза ..........................................................................24

6 Адзіны рынак ..........................................................................30

7 Эканамічны і валютны саюз. Еўра ............................................34

8 Наперад да навукаёмістага грамадства ....................................38

9 Грамадзянская Еўропа ............................................................41

10 Свабода, бяспека і правасуддзе ..............................................45

11 Еўрапейскі саюз на сусветнай арэне .......................................49

12 Якая будучыня Еўропы? .........................................................54

Асноўныя вехі ў гісторыі еўрапейскай інтэграцыі .......................57

# 1 Навошта патрэбны Еўрапейскі саюз?

## Мір

Ідэя аб'яднанай Еўропы калісьці была толькі марай у розумах філосафаў і пракокаў. **Віктор Гюго**, напрыклад, маляваў ва ўяўленні мірныя "Злучаныя Штаты Еўропы", прасякнутыя ідэаламі гуманізму. Дзве страшныя вайны, што раздзіралі кантынент у першай палове XX стагоддзя, не пакінулі каменя на камені ад гэтай мары.

Аднак на руінах Другой сусветнай вайны з'явілася новая надзея. Людзі, што аказалі супраціў таталітарызму падчас вайны, былі поўныя рашучасці пакласці канец міжнароднай нянавісці і саперніцтву ў Еўропе і пабудаваць трывалы мір паміж былымі ворагамі. У перыяд ад 1945 да 1950 года жменька мужных дзяржаўных дзеячаў, што ўключала **Конрада Адэнаўэра, Уінстана Чэрчыля, Алкіда дэ Гасперы і Рабера Шумана**, узялася пераконваць свае народы ўступіць у новую эру. У Заходняй Еўропе будзе новы парадак, заснаваны на агульных інтарэсах яе народаў і нацый, і ён будзе грунтавацца на дагаворах, што гарантуюць уладу закону і роўнасць між усімі краінамі.

Рабер Шуман (міністр замежных спраў Францыі) падхапіў ідэю, першапачаткова вылуча-



ную Жанам Манэ, і 9 мая 1950 года прапанаваў стварыць Еўрапейскае аб'яднанне вугалю і сталі (ЕАВС). У краінах, што некалі змагаліся адна з адной, вытворчасць вугалю і сталі павінна быць аб'яднаная пад агульным кіраваннем - "вярхоўнай уладай". Практычна, але таксама і глыбока сімвалічна выглядала тое, што сыравіна вайны ператваралася ў інструмент паразумення і міру.

Гэты смелы і высакародны крок меў вялікі поспех. Ён паклаў пачатак болей чым паўвекавому мірнаму супрацоўніцтву паміж краінамі - членамі Еўрапейскіх супольнасцей. Маастрыхцкім дагаворам 1992 года інстытуты Супольнасці былі ўмацаваныя і надзеленыя болей шырокімі паўнамоцтвамі - быў створаны Еўрапейскі саюз (ЕС) сам па сабе.

ЕС выканаў цяжкую працу, дапамагаючы аб'яднанню Германіі пасля падзення Берлінскага муру ў 1989 годзе. Калі савецкая імперыя распалася ў 1991 годзе, краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, што на працягу дзесяцігоддзяў жылі пад аўтарытарным ярмом Варшаўскага дагавора, цалкам натуральна вырашылі, што іх будучыня звязаная з сям'ёй дэмакратычных еўрапейскіх нацый.

## Абарона і бяспека

Аднак і ў XXI стагоддзі Еўропа па-ранейшаму мусіць вырашаць праблемы абароны і бяспекі. Гэтыя рэчы нельга пускаць на самацёк. Кожны новы крок па шляху сусветнага развіцця нясе з сабою не толькі магчымасці, але і рызыкі. ЕС мусіць прымаць эфектыўныя захады дзеля гарантавання абароны і бяспекі сваіх 15 (а неўзабаве і 25) дзяржаў-удзельніц. Яму даводзіцца канструктыўна працаваць з рэгіёнамі, што знаходзяцца непасрэдна ля яго межаў, - Паўночнай Афрыкай, Балканамі. Каўказам, Блізкім Усходам. Трагічныя падзеі 11 верасня 2001 года ў Нью-Йорку і Вашынгтоне раскрылі нам усім вочы на тое, наколькі ўразлівыя мы перад разгулам фанатызму і помслівасці.

Інстытуты ЕС адыгрываюць галоўную ролю ў паспяховым стварэнні і дзейнасці еўрапейскай сістэмы, што прынесла рэальны і трывалы мір вялікаму рэгіёну планеты. Але ЕС мусіць таксама бараніць свае ваенна-стратэгічныя інтарэсы праз узаемадзеянне з саюзнікамі - асабліва з саюзнікамі па НАТО - і праз выпрацоўку сапраўды еўрапейскай палітыкі ў сферы бяспекі і абароны.

Унутраная і вонкавая бяспека - гэта два бакі аднаго медаля. Іншымі словамі, ЕС таксама мусіць змагацца з тэрарызмам і арганізаванай злачыннасцю, і гэта азначае, што сілы паліцыі ўсіх краін ЕС павінны цесна супрацоўнічаць. Адна з новых задач, што стаяць перад Еўропай, палягае ў тым, каб ператварыць ЕС у зону свабоды, бяспекі і справядлівасці, дзе справядлівасць і абарона законам даступныя кожнаму ў роўнай ступені. Дзеля гэтых інтарэсаў урадам ЕС неабходна ўзаемадзейнічаць болей шчыльна, і органы кшталту Еўрапола (Еўрапейскае паліцэйскае ўпраўленне) мусяць адыгрываць болей актыўную і эфектыўную ролю.

## Эканамічная і сацыяльная салідарнасць

Еўрапейскі саюз быў створаны дзеля дасягнення палітычных мэтаў, аднак яго развіццё і поспех грунтуюцца на эканамічных асновах - адзіным рынку, утвораным усімі дзяржавамі ЕС, і адзінай валюце (еўра), якую выкарыстоўваюць 12 з іх.

Доля краін ЕС у насельніцтве ўсёй Зямлі няспынна змяншаецца. Таму, каб забяспечыць эканамічны рост і канкурыраваць на сусветнай арэне з іншымі буйнымі эканамічна развітымі краінамі, дзяржавы ЕС павінны дзейнічаць супольна. Ніводная з іх паасобку не валодае дастатковымі магчымасцямі, каб самастойна канкурыраваць у сусветным гандлі. Каб стварыць высокаразвітую эканоміку і знаходзіць новых заказчыкаў, еўрапейскім кампаніям неабходна працаваць на больш буйных рынках, чым іх унутраныя. Вось чаму ЕС прыклаў столькі намаганняў, каб адкрыць адзіны еўрапейскі рынак, здымаючы перашкоды ў гандлі і скасоўваючы бюракратычныя бар'еры, што замінаюць суб'ектам эканамічнай дзейнасці.

Аднак агульнаеўрапейская свабодная канкурэнцыя мусіць быць збалансаваная агульнаеўрапейскай салідарнасцю, якая выяўляецца ў практычнай дапамозе простым людзям. Калі насельніцтва еўрапейскіх краін становіцца ахвярай паводак ці іншых прыродных бедстваў, яму аказваецца дапамога з бюджэту ЕС. Акрамя таго, кантынентальны рынак, што ўключае 380 мільёнаў спажыўцоў, павінен быць выгадны для як мага большай колькасці людзей. Структурныя фонды, што знаходзяцца пад кіраваннем Еўрапейскай камісіі, служаць сродкам заахвочвання і падтрымкі намаганняў, якія прадпрымаюцца рэгіянальнымі і нацыянальнымі уладамі ЕС і скіраваныя на пераадоленне няроўнасці ў развіцці рэгіёнаў Еўропы. Бюджэт ЕС і сродкі, што выдзяляюцца Еўрапейскім інвестыцыйным банкам, выкарыстоўваюцца для ўдасканалення еўрапейскай транспартнай інфраструктуры (напрыклад для развіцця сеткі аўтадарог і хуткасных чыгунак), паляпшаючы доступ да аддаленых рэгіёнаў і стымулюючы транс'еўрапейскі гандаль.

## Умацаванне супрацоўніцтва ў мэтах прасоўвання еўрапейскай мадэлі грамадства

Еўрапейскія постындустрыяльныя грамадствы становяцца ўсё болей складанымі. Узровень жыцця стала расце, аднак па-ранейшаму захоўваецца разрыў паміж багаццем і беднасцю, які можа яшчэ болей павялічыцца па меры таго, як у ЕС будуць уступаць былыя камуністычныя краіны. Вось чаму так важна, каб дзяржавы ЕС болей шчыльна супрацоўнічалі пры вырашэнні сацыяльных праблем.

У канчатковым выніку гэтае супрацоўніцтва выгаднае кожнай краіне ЕС. Паўвекавая гісторыя еўрапейскай інтэграцыі даказала, што цэлае - большае, чым простая сума складаных частак. ЕС як адзінае цэлае валодае нашмат магутнейшым эканамічным, сацыяльным, тэхнічным, гандлёвым і палітычным уплывам, чым могуць даць асобныя намаганні дзяржаўчленаў, нават калі такія высілкі робяцца адначасова. Дзейнічаючы супольна і выступаючы як Еўрапейскі саюз, гэтыя дзяржавы набываюць дадатковыя перавагі.
Чаму? Таму што ЕС уяўляе сабой вядучую гандлёвую сілу свету, якая адыгрывае ключавую ролю ў міжнародным перамоўным працэсе. ЕС уносіць увесь свой гандлёвы і сельскагаспадарчы патэнцыял у Сусветную гандлёвую арганізацыю і ў рэалізацыю Кіёцкага пратакола па мерах зніжэння выкідаў у атмасферу і прадухілення змен клімату. Еўрапейскі саюз выступіў з важнымі ініцыятывамі на Йаханесбургскім саміце па устойлівым развіцці ў жніўні 2002 года. Ён займае выразную пазіцыю ў вострых пытаннях, што тычацца простых людзей, - такіх як навакольнае асяроддзе, узнаўляльныя крыніцы энергіі, прынцып асцярожнасці ў прадуктовай

бяспецы, этычныя аспекты біятэхналогіі і неабходнасць абароны відаў, што вымiраюць.
Старое выслоўе "Моц у яднанні" як ніколі актуальнае сёння для еўрапейцаў. Моц Еўропы абумоўленая яе здольнасцю рабіць аб'яднаныя намаганні на падставе рашэнняў, што прымаюцца дэмакратычнымі інстытутамі: Еўрапейскім саветам, Еўрапейскім парламентам, Саветам міністраў, Еўрапейскай камісіяй, Судом Еўрапейскіх супольнасцей і Судом аўдытараў.

Еўрапейскі саюз мае на мэце распаўсюд чалавечых каштоўнасцей і сацыяльнага прагрэсу. Еўрапейцы бачаць, што глабалізацыя і тэхналагічныя змены перайначваюць свет, і яны хочуць, каб людзі ўсюды былі гаспадарамі, а не ахвярамі гэтага працэсу зменаў. Патрэбы людзей не могуць быць задаволеныя толькі рынкавымі механізмамі ці аднабаковымі дзеяннямі краіны.

Такім чынам, ЕС стаіць на пазіцыях гуманітарных прынцыпаў і той мадэлі грамадства, што маюць падтрымку велізарнай большасці еўрапейцаў. Еўрапейцы шануюць сваю багатую спадчыну каштоўнасцей, што ўключае веру ў правы чалавека, сацыяльную салідарнасць, свабоднае прадпрымальніцтва, справядлівае размеркаванне вынікаў эканамічнага росту, права на бяспечнае навакольнае асяроддзе, павагу да культурных, моўных і рэлігійных адметнасцей і гарманічнае спалучэнне традыцый і прагрэсу.

Хартыя фундаментальных правоў ЕС, абвешчаная ў Ніццы 7 снежня 2000 года, прадугледжвае ўсе правы, якія сёння прызнаюцца 15 дзяржавамі - членамі ЕС і іх грамадзянамі. Еўрапейцы валодаюць багаццем нацыянальных і мясцовых культур, што адрозніваюць жыхароў кантынента між сабою, аднак іх яднае агульная спадчына каштоўнасцей, што вылучаюць еўрапейцаў з астатняга свету.

Маастрыхцкі дагавор ўпершыню замацаваў прынцып субсідыярнасці, які акрэслівае характар дзейнасці Еўрапейскага саюза. Гэта азначае, што ЕС і яго інстытуты робяць захады толькі ў тым выпадку, калі яны будуць болей дзейсныя на ўзроўні ЕС, чым на нацыянальным або мясцовым. Гэты прынцып выключае залішняе ўмяшанне ЕС у штодзённае жыццё яго грамадзян. Еўрапейская адметнасць з'яўляецца каштоўнасцю, якую належыць захоўваць; яе не варта блытаць з аднастайнасцю, якую еўрапейцы безумоўна адхіляюць.

# 2. Этапы гісторыі

Сённяшні Еўрапейскі саюз з'яўляецца вынікам намаганняў, прыкладзеных мужчынамі і жанчынамі, што працуюць дзеля аб'яднанай Еўропы. ЕС абапіраецца на іх канкрэтныя дасягненні. У ніводным іншым рэгіёне свету незалежныя дзяржавы яшчэ не аб'ядноўвалі свае суверэнітэты ў такой ступені і ў гэтакіх розных галінах, што маюць велізарную важнасць для іх грамадзян. ЕС стварыў адзіную валюту і дынамічны агульны рынак, дзе людзі, паслугі, тавары і капітал рухаюцца вольна. Ён імкнецца зрабіць так, каб у выніку сацыяльнага прагрэсу і справядлівай канкурэнцыі як мага болей людзей маглі скарыстацца перавагамі гэтага адзінага рынку.

Асноўныя правілы Еўрапейскага саюза выкладаюцца ў шэрагу дагавораў:

- Парыжскі дагавор 1951 года, што заснаваў Еўрапейскае аб'яднанне вугалю і сталі (ЕАВС);

- Рымскія дагаворы 1957 года, што заснавалі Еўрапейскую эканамічную супольнасць (ЕЭС) і Еўрапейскую супольнасць па атамнай энергіі (Еўраатам).



Гэтыя асноўныя дагаворы пазней былі дапоўненыя наступнымі дакументамі:

- Адзіным еўрапейскім актам (1986 г.);
- Дагаворам аб Еўрапейскім саюзе (Маастрыхт, 1992 г.);
- Амстэрдамскім дагаворам (1997 г.);
- Ніццкім дагаворам (2001 г.).

Гэтыя дамовы значна ўмацавалі прававыя стасункі паміж дзяржавамі ЕС. Законы Еўрапейскага саюза робяць непасрэдны ўплыў на грамадзян ЕС і надзяляюць іх зусім канкрэтнымі правамі.

Першы крок на шляху еўрапейскай інтэграцыі быў зроблены тады, калі шэсць краін (Бельгія, Федэратыўная Рэспубліка Германія, Францыя, Італія, Люксембург і Нідэрланды) стварылі агульны рынак вугалю і сталі. Мэта гэтага кроку, здзейсненага неўзабаве пасля Другой сусветнай вайны, палягала ў тым, каб забяспечыць мір паміж перамоглымі і пераможанымі нацыямі Еўропы. Гэты крок паяднаў іх як роўных праз супрацоўніцтва ў агульных інстытутах.

Тады ж шэсць дзяржаў-удзельніц прынялі рашэнне стварыць Еўрапейскую эканамічную супольнасць (ЕЭС), заснаваную на агульным рынку з шырокім спектрам тавараў і паслуг. Мытныя пошліны паміж гэтымі шасцю краінамі былі цалкам скасаваныя 1 ліпеня 1968 года, і ў 1960-х гадах была ўведзеная агульная палітыка, у прыватнасці, у галіне гандлю і сельскай гаспадаркі.

Гэты крок быў настолькі паспяховы, што Данія, Ірландыя і Вялікабрытанія прынялі рашэнне далучыцца да Еўрапейскіх супольнасцей. Гэтае першае пашырэнне з шасці да дзевяці ўдзельнікаў адбылося ў 1973 годзе. У той самы час Супольнасці ўзялі на сябе чарговыя задачы і пачалі праводзіць новую сацыяльную, рэгіянальную і прыродаахоўную палітыку. Для рэалізацыі рэгіянальнай палітыкі ў 1975 годзе быў заснаваны Еўрапейскі рэгіянальны фонд развіцця.

На пачатку 1970-х гадоў лідэры ЕЭС зразумелі, што мусяць прывесці свае эканамічныя сістэмы ў адпаведнасць адна з адной і што ў рэшце рэштаў патрэбны валютны саюз. Аднак прыблізна ў той самы час ЗША вырашылі прыпыніць канверсоўнасць долара ў золата. Гэта стала прадвесцем перыяду вялікай нестабільнасці на сусветных валютных рынках, што ўзмацнялася нафтавымі крызісамі 1973 і 1979 гадоў. Увядзенне Еўрапейскай валютнай сістэмы (ЕВС) ў 1979 годзе дазволіла стабілізаваць курсы абмену валют і заахвоціла дзяржавы - члены Супольнасці ажыццяўляць жорсткую палітыку, што дазваляла захоўваць узаемную салідарнасць і дысцыплінаваць свае эканамічныя сістэмы.

У 1981 годзе да Супольнасцей далучылася Грэцыя, у 1986 годзе яе прыклад узялі Іспанія і Партугалія. Тым болей пільнай стала патрэба ўвесці структурныя праграмы, такія як першыя Аб'яднаныя міжземнаморскія праграмы, скіраваныя на скарачэнне розніцы ў эканамічным развіцці паміж 12 дзяржавамі-удзельніцамі.

У той самы час ЕЭС пачала адыгрываць болей прыкметную ролю на міжнароднай арэне. З краінамі Афрыкі, басейна Карыбскага мора і Ціхага акіяна яна падпісала шэраг канвенцый аб дапамозе і гандлі (I, II, III і IV Ламэйскія канвенцыі, 1975-1989 гг.), што прывялі да заключэння Пагаднення ў Катану ў чэрвені 2000 года. Такія інструменты дапамагаюць Еўропе, вядучай гандлёвай сіле свету, дзейнічаць - і дзейнічаць заўважна - на міжнароднай арэне. Канчатковая мэта Еўрапейскага саюза палягае ў ажыццяўленні агульнай вонкавай палітыкі і палітыкі ў галіне бяспекі.

Сусветны эканамічны спад пачатку 1980 гадоў спарадзіў хвалю "еўрапесімізму". Але надзея адрадзілася ў 1985 годзе, калі Еўрапейская камісія пад кіраўніцтвам старшыні **Жака Дэлора** апублікавала "Белую кнігу", што вызначыла графік завяршэння фарміравання Еўрапейскага адзінага рынку да 1 студзеня 1993 года. Супольнасці прынялі гэты амбіцыйны мэтанакіраваны дакумент і замацавалі яго ў Адзіным еўрапейскім акце, што быў падпісаны ў лютым 1986 года і набыў моц 1 ліпеня 1987 года.

Палітычнае аблічча Еўропы карэнным чынам змянілася з падзеннем Берлінскага муру ў 1989 годзе. Наступствам гэтага з'явілася ўз'яднанне Германіі 3 кастрычніка 1990 года і прыход дэмакратыі ў краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, што выслабаніліся ад савецкага кантролю. Сам Савецкі Саюз спыніў існаванне ў снежні 1991 года.

Між тым Еўрапейскія супольнасці таксама змяняліся. Дзяржавы ЕС вялі перамовы пра заключэнне новага дагавора, які быў зацверджаны Еўрапейскім саветам (г.зн. іх прэзідэнтамі і/або прэм'ер-міністрамі) у Маастрыхце ў снежні 1991 года. Гэты "Дагавор аб Еўрапейскім саюзе" набыў моц 1 лістапада 1993 года. ЕЭС была перайменаваная ў Еўрапейскую супольнасць. Яшчэ болей, праз дадаванне сфер міжурадавага супрацоўніцтва да той сістэмы Супольнасці, што існавала, дагавор стварыў Еўрапейскі саюз (ЕС). Акрамя таго, ён паставіў новыя амбіцыйныя мэты перад дзяржавамі-удзельніцамі: стварэнне валютнага саюза да 1999 года, еўрапейскае грамадзянства, новая агульная палітыка, у тым ліку агульная вонкавая палітыка і палітыка ў галіне бяспекі, і меры ўнутранай бяспекі.

Новае еўрапейскае развіццё і зменлівая геапалітычная сітуацыя на кантыненце заахвоцілі яшчэ тры краіны - Аўстрыю, Фінляндыю і Швецыю - далучыцца да ЕС 1 студзеня 1995 года. Цяпер у саюз уваходзілі 15 дзяржаў, і ён уступіў на шлях да свайго дасюль самага выдатнага дасягнення - замены нацыянальных валют адзінай еўрапейскай валютай еўра. 1 студзеня 2002 года банкноты і манеты еўра былі выпушчаныя ў абарачэнне ў 12 краінах ЕС ("зона еўра"). Сёння еўра з'яўляецца адной з вядучых валют свету нароўні з доларам ЗША.

Цяпер, калі свет уступіў у XXI стагоддзе, еўрапейцы маюцца разам вырашаць праблему глабалізацыі. Новыя рэвалюцыйныя тэхналогіі і шпаркае развіццё Інтэрнета пераўтвараюць сусветную эканоміку. Аднак гэтыя глыбокія эканамічныя зрухі нясуць з сабою сацыяльныя ўзрушэнні і рэзкія змены ў культуры.

На сустрэчы ў Лісабоне ў сакавіку 2000 года Еўрапейскі саюз зацвердзіў шматбаковую стратэгію мадэрнізацыі эканомікі ЕС у мэтах павышэння яе канкурэнтаздольнасці на сусветным рынку ўвогуле і ў дачыненні да яго іншых асноўных удзельнікаў, такіх як ЗША і новыя індустрыяльныя краіны. Лісабонская стратэгія мае на мэце адкрыццё ўсіх галін эканомікі для канкурэнцыі, заахвочванне інвестыцый у інавацыі і бізнес, а таксама мадэрнізацыю еўрапейскай сістэмы адукацыі ў адпаведнасці з патрэбамі інфармацыйнага грамадства.

У той самы час беспрацоўе і рост кошту пенсійнага забеспячэння ствараюць сур'ёзны ціск на эканоміку дзяржаў ЕС, робячы рэформы яшчэ болей пільна патрэбнымі. Выбаршчыкі ўсё больш настойліва заклікаюць свае ўрады знайсці практычныя рашэнні гэтых праблем.

Ледзьве толькі Еўрапейскі саюз пашырыўся да 15 дзяржаў, як у яго дзверы пастукаліся яшчэ 12 краін. У сярэдзіне 1990-х гадоў ён атрымаў заяўкі на далучэнне ад краін былога савецкага блока (Балгарыі, Чэшскай Рэспублікі, Венгрыі, Польшчы, Румыніі і Славакіі), трох прыбалтыйскіх краін, што раней уваходзілі ў Савецкі Саюз (Эстоніі, Латвіі і Літвы), адной з рэспублік былой Югаславіі (Славеніі) і дзвюх краін Міжземнамор'я (Кіпра і Мальты).

ЕС вітаў магчымасць садзейнічаць стабілізацыі Еўрапейскага кантынента і распаўсюдзіць перавагі аб'яднання Еўропы на гэтыя маладыя дэмакратыі. Перамовы аб далучэнні з гэтымі краінамі-кандыдаткамі былі пачатыя ў Люксембургу ў снежні 1997 года і ў Хельсінкі ў снежні 1999 года.Саюз быў на шляху да самага буйнога пашырэння за ўсю сваю гісторыю. Перагаворы з 10 краінамі-кандыдаткамі былі завершаныя 13 снежня 2002 года ў Капенгагене. У 2004 годзе ў Еўрапейскім саюзе будзе 25 дзяржаў, і ён будзе расці па меры таго, як новыя краіны будуць далучацца ў наступныя гады.

Больш чым паўвекавая інтэграцыя зрабіла велізарны ўплыў на гісторыю Еўропы і менталітэт еўрапейцаў. Урады дзяржаў ЕС, незалежна ад палітычнай афарбоўкі, разумеюць, што эпоха абсалютнага нацыянальнага суверэнітэту мінула і што толькі аб'яднаўшы намаганні ды ідучы шляхам "ад гэтага часу агульнага лёсу" (кажучы словамі Дагавора ЕАВС), іх старажытныя нацыі здолеюць забяспечваць бесперапынны сацыяльна-эканамічны прагрэс і захоўваць уплыў у свеце.

Інтэграцыя садзейнічала пераадоленню адвечнай варожасці паміж еўрапейскімі краінамі. Аргументы перавагі і палітыкі з пазіцыі сілы ў вырашэнні міжнародных спрэчак былі замененыя калектыўным метадам супрацоўніцтва. Гэты метад, заснаваны на балансе нацыянальных і агульных інтарэсаў і павазе да нацыянальных адметнасцей у межах прыналежнасці да саюза, сёння важны як ніколі. Падчас "халоднай вайны" ён дапамагаў дэмакратычным і свабодалюбным краінам Еўропы захоўваць адзінства. Канец антаганізму паміж усходам і захадам, палітыка-эканамічнае ўз'яднанне кантынента з'яўляюцца перамогай еўрапейскага духу - духу, у якім народы Еўропы маюць сёння патрэбу як ніколі.

Еўрапейскі саюз прапануе адказ на велізарную праблему глабалізацыі - адказ, што выяўляе агульныя каштоўнасці, у якія вераць еўрапейцы. Але, што самае галоўнае, ЕС дае найболей надзейную з усіх магчымых гарантый вольнай і мірнай будучыні.

# 3 Пашырэнне

## Капенгаген: гістарычны саміт

13 снежня 2002 года ў Капенгагене Еўрапейскі савет зрабіў найважнейшы крок ў гісторыі еўрапейскага аб'яднання. Ён прыняў рашэнне аб уваходжанні ў ЕС яшчэ 10 краін 1 мая 2004 года.

Гэтым рашэннем Еўрапейскі саюз не проста пашыраў сваю тэрыторыю і насельніцтва. Гэтым ён падводзіў рысу пад расколам на нашым кантыненце - знішчаў тую прорву, што ад 1945 года аддзяляла свабодны свет ад камуністычнага. Такім чынам, пятае пашырэнне ЕС мела і палітычнае, і маральнае значэнне.

Не толькі геаграфічна, але і з пункту гледжання сваёй культуры, гісторыі і памкненняў гэтыя краіны - Кіпр, Чэшская Рэспубліка, Эстонія, Венгрыя, Латвія, Літва, Мальта, Польшча, Славакія і Славенія - несумненна з'яўляюцца еўрапейскімі. Уступаючы ў Еўрапейскі саюз, яны ўліваюцца ў сям'ю еўрапейскіх дэмакратычных краін і займаюць па справядлівасці належнае месца ў вялікім праекце, задуманым бацькамі-



заснавальнікамі ЕС. Дагаворы аб далучэнні, падпісаныя ў Афінах 16 красавіка 2003 года, дазваляюць людзям з новых дзяржаў ЕС галасаваць і балаціравацца нароўні з іншымі грамадзянамі ЕС на выбарах у Еўрапейскі парламент ў чэрвені 2004 года.

## Доўгая дарога да членства ў ЕС

Шлях да гэтага апошняга пашырэння пачынаецца ў 1989 годзе з падзення Берлінскага муру і "жалезнай заслоны". ЕС адрэагаваў неадкладна заснаваннем праграмы фінансавай дапамогі PHARE, разлічанай на спрыянне маладым дэмакратыям у аднаўленні эканомікі і заахвочванні палітычных рэформаў. 22 чэрвеня 1993 года ў Капенгагене Еўрапейскі саюз упершыню заявіў, што *"асацыяваныя краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы мусяць стаць членамі Еўрапейскага саюза, калі выкажуць такое жаданне".*

Адначасова Еўрапейскі саюз усталяваў тры асноўныя крытэрыі, якім павінны адпавядаць краіны-кандыдаткі, каб уступіць у ЕС.

- Першы - палітычны крытэрый: краіны-кандыдаткі мусяць валодаць стабільнымі інстытутамі, што гарантуюць дэмакратыю, уладу закону, правы чалавека, павагу і абарону меншасцей.

- Другі - эканамічны крытэрый: краіны-кандыдаткі павінны мець эфектыўную рынкавую эканоміку і быць здольныя існаваць пры ціску канкурэнцыі і рынкавых сіл на абсягу саюза.
- Трэці - здольнасць прымаць на сябе абавязкі членства ў ЕС, у тым ліку адданасць мэтам палітычнага, эканамічнага і валютнага саюза. Гэта азначае, што краіны-кандыдаткі мусяць прыняць усю сукупнасць прававых нормаў ЕС, вядомую як acquis communautaire.

Камісія дала рэкамендацыі, а парламент выказаў сваё меркаванне. На гэтай падставе Еўрапейскі савет ў Люксембургу (снежань 1997 года) і Хельсінкі (снежань 1999 года) даў згоду на перамовы з 10 краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, а таксама з Кіпрам і Мальтай.

Амстэрдамскі дагавор (падпісаны 2 кастрычніка 1997 года) і Ніцкі дагавор (26 лютага 2001 года) маюць на мэце кансалідаваць саюз і спрасціць сістэму прыняцця рашэнняў да яго пашырэння.

Перагаворы з 10 краінамі з ліку кандыдатак былі завершаныя ў Капенгагене 13 снежня 2002 года. Дасягнутыя пагадненні забяспечваюць гэтым новым дзяржавам-членам механізм і перыяд пераходу, неабходныя для таго, каб выканаць усе свае абавязанні. Перад далучэннем кожная з іх мусіць прыняць уласныя нацыянальныя законы, якія цалкам уключаюць у сябе acquis communautaire, што складае 26 000 заканадаўчых актаў аб'ёмам да 80 000 старонак. Гэтае заканадаўства мусіць не толькі быць прынятае, але і прымяняцца на практыцы.

Відавочна, што гэта вымагае вялікага аб'ёму працы нацыянальных парламентаў і іншых органаў улады ў краінах, дзе інстытуты былі перабудаваныя толькі нядаўна. Аднак гэта неабходна дзеля таго, каб палітыка ЕС і адзіны еўрапейскі рынак маглі і надалей дзейнічаць бесперабойна. Цяперашнія 15 дзяржаў-членаў, безумоўна, робяць усё магчымае, каб дапамагчы гэтаму працэсу.

Еўрапейскі саюз разумее небяспеку таго, што пашырэнне такога маштабу можа ператварыць яго проста ў зону свабоднага гандлю. Таму ЕС хоча умацаваць свае ўнутраныя сувязі і забяспечыць перадумовы таго, каб гэтая агульнакантынентальная сям'я нацый магла ўзаемадзейнічаць эфектыўна і вынікова. Вось чаму ён заснаваў Канвент пад старшынёўствам **Валеры Жыскар д'Эстэна** дзеля абмеркавання будучыні Еўропы і складання праекта Канстытуцыі новага ЕС у складзе 25 краін. Канвент скончыў гэтую працу ў чэрвені 2003 года, і 20 чэрвеня ў Фесалоніках Еўрапейскі саюз абвясціў, што лічыць праект

канстытуцыйнага дагавора добрай асновай для пачатку міжурадавай канферэнцыі.
Паўнапраўны ўдзел у працы Канвента ўзялі новыя дзяржавы ЕС. Кожная з іх прызначыць камісара, які пачне выконваць свае абавязкі з 1 мая 2004 года, калі набудуць моц пагадненні аб далучэнні. Пасля таго як у чэрвені 2004 года будзе абраны новы Еўрапейскі парламент, ён прагаласуе датычна кандыдатур членаў новай Камісіі, што распачне працу з 1 лістапада 2004 года.
Як падкрэсліў старшыня Камісіі **Рамана Продзі**, саюз, захоўваючы адданасць сваім абавязкам перад краінамі-кандыдаткамі, паклаў канец несправядлівасці і жорсткасці XX стагоддзя з яго таталітарызмам і "халоднай вайной". Аднак ЕС таксама дэманструе здольнасць ажыццявіць новую філасофію міжнародных стасункаў, у якой знаходзяць адлюстраванне адзінства Еўропы і разам з тым яе разнастайнасць, нацыянальныя адметнасці і агульныя каштоўнасці. *"Працэс еўрапейскай інтэграцыі і найноўшая гісторыя Еўропы служаць прызнаннем фактараў, якія нас збліжаюць, а таксама тых, што нас раз'ядноўваюць. Пашырэнне адзначыць першую спробу стварыць новы тып грамадства ў маштабах кантынента. Яно прынясе з сабой нябачанае пашырэнне правоў грамадзян і ўзмацненне дзяржаў"*. (З прамовы старшыні Продзі перад Еўрапейскім парламентам у Страсбургу 6 лістапада 2002 года.)

Сярэдні даход 75 мільёнаў новых грамадзян ЕС складае толькі 40% ад даходу жыхароў астатніх краін саюза. Вось чаму мерапрыемствы, звязаныя з далучэннем, прадугледжваюць фінансавую дапамогу на 10 мільярдаў еўра ў 2004 годзе, 12,5 мільярда ў 2005 годзе і 15 мільярдаў у 2006-м. Гэта дазволіць эканамічным сістэмам 10 новых краін ЕС дагнаць астатнія 15. Асобныя з іх дэманструюць устойлівы рост, інтэграцыя паміж "дзесяткай" і іншымі пятнаццацю краінамі ў значнай ступені завершаная дзякуючы скасаванню гандлёвых бар'ераў у 1990-х гадах і ўнутраным рэформам, што праводзяцца ўрадамі "дзесяткі". Прыблізна 40 мільярдаў еўра, што будуць выплачаныя ў 2004-2006 гадах з бюджэту ЕС новым дзяржавам-членам, будуць у асноўным выдаткаваныя на структурныя і рэгіянальныя праекты, падтрымку сельскай гаспадаркі, развіццё сельскіх рэгіёнаў, унутраную палітыку і адміністрацыйныя патрэбы. Пакет быў узгоднены ЕС і 10 новымі дзяржавамі ў Капенгагене ў снежні 2002 года. Ён адпавядае палажэнням, вызначаным пасяджэннем Еўрапейскага савета ў Берліне (у сакавіку 1999 года) датычна выдаткаў ЕС да 2006 года.

## Магчымыя маштабы ЕС у будучыні

Пашыраны ЕС у складзе 25 краін, што налічвае 454 мільёны чалавек, атрымае далейшае пашырэнне ў 2007 годзе з далучэннем Балгарыі і Румыніі, калі ўсё будзе ісці ў адпаведнасці з планам, узгодненым у Капенгагене. На тым пасяджэнні Еўрапейскі савет таксама згадзіўся, што ў снежні 2004 года, магчыма, прыме рашэнне пра пачатак афіцыйных перамоў аб далучэнні Турцыі, калі гэта будзе рэкамендавана ў дакладзе Еўрапейскай камісіі. Перагаворы з краінай-кандыдаткай пачынаюцца пасля таго, як яна стане адпавядаць палітычным і эканамічным крытэрыям ЕС.

Яшчэ ў 1999 годзе пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Хельсінкі пастанавіла, што *"Турцыя з'яўляецца дзяржавай-кандыдаткай, якая мае далучыцца да саюза на падставе крытэрыяў, што ўжываюцца да іншых дзяржаў-кандыдатак"*. Турцыя ўваходзіць у НАТО і Савет Еўропы. Яна мае дагавор аб супрацоўніцтве з ЕС з 1964 года і падала заяўку на ўступленне ў ЕС у 1987 годзе.

Аднак Турцыя месціцца на самым краі еўрапейскага кантынента, і перспектыва яе ўступлення ў ЕС спараджае пытанні пра тое, дзе варта правесці канчатковую мяжу Еўрапейскага саюза. Ці можа любая краіна, дзе б яна ні знаходзілася, падаць заяўку на ўступленне ў ЕС і распачаць перамоўны працэс пры ўмове, што яна адпавядае палітычным і эканамічным крытэрыям, вызна-

чаным у Капенгагене? Безумоўна, заходнебалканскія краіны, такія як Албанія, Боснія і Герцагавіна, Харватыя, Македонія, Чарнагорыя і Сербія, могуць падаць заяўку пасля таго, як дасягнуць палітычнай стабільнасці і будуць адпавядаць капенгагенскім крытэрыям.

Вядома, у інтарэсах ЕС спрыяць стабільнасці ў рэгіёнах, што знаходзяцца ля яго парога. Пашырэнне адсоўвае і падаўжае межы саюза. У 2004 годзе яго найбліжэйшымі суседзямі стануць Беларусь, Расія і Украіна. Саюзу давядзецца актывізаваць прымежнае супрацоўніцтва з імі ў пытаннях транспарту і палітыкі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, а таксама ўнутранай бяспекі, барацьбы з нелегальнай іміграцыяй і іншымі формамі міжнароднай злачыннасці.

Калі яно будзе адзначана поспехам, ці можа тая самая стратэгія быць ужытая ў стасунках ЕС з краінамі паўднёвага Міжземнамор'я? Такія пытанні даюць падставу для дэбатаў пра тое, што ўвогуле азначае паняцце "еўрапеец", якая канчатковая мэта еўрапейскай інтэграцыі і ў чым палягаюць глабальныя інтарэсы ЕС у шырокім сэнсе. Надышоў час перагледзець і ўзмацніць прэферэнцыйныя пагадненні ЕС з найбліжэйшымі суседзямі - і зрабіць гэта ў як мага шырэйшым кантэксце.

## Асноўныя этапы пятага пашырэння ЕС

***19 снежня 1989 года:*** ЕС засноўвае праграму, вядомую як PHARE, для прадастаўлення фінансавай і тэхнічнай дапамогі краінам Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

***3 і 16 ліпеня 1990 года:*** Кіпр і Мальта падаюць заяўкі на ўступленне ў ЕС.

***22 чэрвеня 1993 года:*** пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Капенгагене ўсталёўвае крытэрыі прыёму ў Еўрапейскі саюз.

***31 сакавіка і 5 красавіка 1994 года:*** Венгрыя і Польшча падаюць заяўкі на ўступленне ў ЕС.

***1995 год:*** атрыманыя заяўкі ад Славакіі (21 чэрвеня), Румыніі (22 чэрвеня), Латвіі (13 кастрычніка), Эстоніі (24 лістапада), Літвы (8 снежня) і Балгарыі (14 снежня).

***1996 год:*** атрыманыя заяўкі ад Чэшскай Рэспублікі (17 студзеня) і Славеніі (10 чэрвеня).

***12-13 снежня 1997 года:*** пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Люксембургу прымае рашэнне пра пачатак працэсу пашырэння.

***10-11 снежня 1999 года:*** пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Хельсінкі пацвярджае, што перамовы аб далучэнні будуць весціся з 12 краінамі-кандыдаткамі. Турцыя разглядаецца як дзяржава-кандыдатка, "што мае далучыцца да саюза".

***13 снежня 2002 года:*** ЕС дасягае пагаднення з 10 краінамі-кандыдаткамі пра далучэнне 1 мая 2004 года.

***16 красавіка 2003 года:*** 10 дагавораў аб далучэнні падпісаныя ў Афінах.

***1 мая 2004 года:*** 10 новых дзяржаў далучаюцца да ЕС.

***Снежань 2004 года:*** рашэнне пра магчымасць пачатку перамоў аб далучэнні з Турцыяй.

***2007 год:*** год, вызначаны пасяджэннем Еўрапейскага савета ў Капенгагене для ўступлення Балгарыі і Румыніі ў ЕС.

# 4 Як працуе саюз?

Еўрапейскі саюз - гэта болей, чым проста канфедэрацыя краін, але гэта і не федэральная дзяржава. Па сутнасці, гэта нешта зусім іншае, што не мае прэцэдэнтаў у гісторыі. Яго палітычная сістэма бесперапынна эвалюцыянавала на працягу апошніх 50 гадоў і грунтуецца на сістэме дагавораў, пачынаючы з падпісаных у Парыжы і Рыме ў 1950-х гадах і канчаючы Маастрыхцкім, Амстэрдамскім, Ніццкім дагаворамі, заключанымі ў 1990-х гадах.

Згодна з гэтымі дамовамі дзяржавы саюза дэлегуюць частку свайго нацыянальнага суверэнітэту агульным інстытутам, што рэпрэзентуюць не толькі іх нацыянальныя, але і калектыўныя інтарэсы. Гэтыя дагаворы складаюць так званае "першаснае заканадаўства". Вытворным ад іх з'яўляецца вялікі аб'ём "другаснага заканадаўства", што непасрэдна ўздзейнічае на штодзённае жыццё грамадзян Еўрапейскага саюза. Яно ўключае ў асноўным пастановы, дырэктывы і рэкамендацыі.

Гэтыя законы, а таксама палітыка ЕС у цэлым, вынікаюць з рашэнняў, што прымаюцца трыма асноўнымі інстытутамі:



- Саветам Еўрапейскага саюза (які прадстаўляе дзяржавы-члены);
- Еўрапейскім парламентам (які прадстаўляе грамадзян);
- Еўрапейскай камісіяй (палітычна аўтаномным органам, што абараняе калектыўныя еўрапейскія інтарэсы).

Гэты **"інстытуцыйны трохкутнік"** можа функцыянаваць толькі тады, калі ўсе тры інстытуты будуць шчыльна ўзаемадзейнічаць і давяраць адзін аднаму. *"Дзеля выканання сваёй задачы і ў адпаведнасці з палажэннямі гэтага дагавора Еўрапейскі парламент, дзейнічаючы супольна з Саветам і Камісіяй, прымае пастановы, выпускае дырэктывы, прымае рашэнні, дае рэкамендацыі ці заключэнні"*. (Артыкул 249 Маастрыхцкага дагавора.)

## Савет Еўрапейскага саюза

Савет Еўрапейскага саюза з'яўляецца галоўнай дырэктыўнай установай ЕС. Раней ён быў вядомы як Савет міністраў. Дзеля сцісласці называецца проста Саветам.

Кожная краіна ЕС па чарзе старшынствуе ў Савеце на працягу шасці месяцаў. У кожным пасяджэнні Савета бярэ ўдзел па адным міністры ад кожнай дзяржавы-члена. Выбар міністраў для ўдзелу ў пасяджэнні залежыць ад тэмы абмеркавання. Калі гэта вонкавая палітыка, тады ў нарадзе будуць браць удзел міністры замежных спраў ад кожнай краіны, калі сельская гаспадарка - міністры сельскай гаспадаркі і гэтак далей. Існуе дзевяць "канфігурацый" Савета, што ахопліваюць усе галіны палітыкі, у тым ліку прамысловасць, транспарт, навакольнае асяроддзе і да т.п. Праца Савета ў цэлым плануецца і каардынуецца Саветам па агульных пытаннях і міжнародных стасунках.

Падрыхтоўка пасяджэнняў Савета праводзіцца Камітэтам пастаянных прадстаўнікоў (КПП), што складаецца з паслоў дзяржаў-членаў пры ЕС, якім дапамагаюць службовыя асобы нацыянальных міністэрстваў. Адміністрацыйная праца Савета ажыццяўляецца яго Генеральным сакратарыятам, што пастаянна знаходзіцца ў Брусэлі.

Савет і Еўрапейскі парламент дзеляць між сабой заканадаўчую ўладу і адказнасць за бюджэт. Акрамя таго, Савет заключае міжнародныя пагадненні, пасля таго як Камісія правяла па іх перамовы. У залежнасці ад характару дагавораў Савет мусіць прымаць рашэнні адзінагалосна, большасцю ці кваліфікаванай большасцю галасоў.

Па важных пытаннях, такіх як папраўкі да дагавораў, новая агульная палітыка ці прыём у саюз новай дзяржавы, Савет прымае адзінагалоснае рашэнне.

Найчасцей патрабуецца кваліфікаваная большасць галасоў, інакш кажучы, рашэнне не прымаецца, калі за яго не будзе пададзеная пэўная мінімальная колькасць галасоў. Колькасць галасоў, якую можа падаць кожная краіна ЕС, прыблізна прапарцыйная колькасці яе насельніцтва. Да 1 мая 2004 года гэтыя галасы размяркоўваюцца наступным чынам:

| | |
|---|---|
| • Германія, Францыя, Італія, Вялікабрытанія | 10 |
| • Іспанія | 8 |
| • Бельгія, Грэцыя, Нідэрланды, Партугалія | 5 |
| • Аўстрыя, Швецыя | 4 |
| • Данія, Ірландыя, Фінляндыя | 3 |
| • Люксембург | 2 |
| Усяго | 87 |

Мінімальная колькасць галасоў, неабходная для атрымання кваліфікаванай большасці, складае 62 з 87 (г.зн. 71,3%).

На працягу шасці месяцаў пачынаючы з 1 мая 2004 года, калі новыя краіны-члены далучацца

да ЕС, дзейнічаюць правілы пераходнага перыяду. З 1 лістапада 2004 года галасы краін размяркоўваюцца наступным чынам:

| | |
|---|---|
| • Германія, Францыя, Італія і Вялікабрытанія | 29 |
| • Іспанія і Польшча | 27 |
| • Нідэрланды | 13 |
| • Бельгія, Чэшская Рэспубліка, Грэцыя, Венгрыя і Партугалія | 12 |
| • Аўстрыя і Швецыя | 10 |
| • Данія, Ірландыя, Літва, Славакія і Фінляндыя | 7 |
| • Кіпр, Эстонія, Латвія, Люксембург і Славенія | 4 |
| • Мальта | 3 |
| Усяго | 321 |

Для атрымання кваліфікаванай большасці будзе патрабавацца мінімум 232 галасы (72,3%). Акрамя таго:

- рашэнне павінна быць ухваленае большасцю дзяржаў-членаў (у асобных выпадках двума трацінамі);
- любая дзяржава-член можа запатрабаваць пацвярджэння таго, што галасы, пададзеныя "за", рэпрэзентуюць мінімум 62% насельніцтва ЕС.

## Еўрапейскі савет

У Еўрапейскі савет уваходзяць прэзідэнты і прэм'ер-міністры ўсіх краін ЕС, а таксама старшыня Еўрапейскай камісіі. Акрамя таго, на кожным пасяджэнні Еўрапейскага савета выступае старшыня Еўрапейскага парламента.

Гісторыя Еўрапейскага савета бярэ пачатак у 1974 годзе, калі палітычныя лідэры ЕС (кіраўнікі дзяржаў або ўрадаў) пачалі склікаць рэгулярныя нарады. Гэта практыка была замацаваная ў якасці афіцыйнай Адзіным еўрапейскім актам (1987 год). Цяпер Еўрапейскі савет збіраецца звычайна чатыры разы на год. Яго старшынёй з'яўляецца прэзідэнт або прэм'ер-міністр краіны, якая ў гэты час старшынствуе ў Савеце Еўрапейскага саюза.

З улікам усё большага значэння дзейнасці ЕС у нацыянальным палітычным жыцці мэтазгодна, каб прэзідэнты і прэм'ер-міністры краін мелі магчымасць рэгулярна сустракацца і абмяркоўваць асноўныя праблемы Еўропы. Згодна з Маастрыхцкім дагаворам Еўрапейскі савет афіцыйна стаў ініцыятарам галоўных палітычных рашэнняў саюза і атрымаў паўнамоцтвы вырашаць найболей складаныя пытанні, датычна якіх міністры (на пасяджэннях Савета Еўрапейскага саюза) не змаглі паразумецца.

Еўрапейскі савет стаў буйной грамадскай з'явай, бо ўсе яго члены - гэта добра вядомыя дзяржаўныя дзеячы, а некаторыя пытанні, што яны абмяркоўваюць, бываюць надта спрэчнымі. Савет таксама абмяркоўвае актуальныя сусветныя праблемы. Яго мэта палягае ў тым, каб выказваць адзіную думку датычна міжнародных праблем, выпрацоўваючы агульную вонкавую палітыку і палітыку ў галіне бяспекі.

Такім чынам, Еўрапейскі савет з'яўляецца найвышэйшым палітычным органам ЕС. Асобныя дзяржавы хацелі б, каб ён стаў урадам Еўропы і каб адзін з яго членаў прадстаўляў саюз на сусветнай арэне. Ці павінна такая асоба выбірацца Еўрапейскім саветам, або ёю аўтаматычна мусіць быць старшыня Еўрапейскай камісіі? Датычна гэтай праблемы няма адзінай думкі.

А пакуль што ролю "містэра Еўропы" выконвае вярхоўны прадстаўнік ЕС у пытаннях агульнай вонкавай палітыкі і палітыкі бяспекі (гэта пасада заснаваная Амстэрдамскім дагаворам), які з'яўляецца таксама генеральным сакратаром Савета. У 1999 годзе на гэтую пасаду быў прызначаны Хаўер Салана.

## Еўрапейскі парламент

Еўрапейскі парламент з'яўляецца выбарным органам, які рэпрэзентуе грамадзян ЕС і бярэ ўдзел у заканадаўчым працэсе. З 1979 года члены Еўрапейскага парламента абіраюцца непасрэдна ўсеагульным галасаваннем кожныя пяць гадоў.

Да выбараў 2004 года колькасць членаў парламента складала 626. Потым пашырэнне ЕС прывядзе да далейшага росту гэтай колькасці. Колькасць членаў парламента ад кожнай краіны паказаная ніжэй (у алфавітным парадку паводле назвы краіны на роднай мове).

| | 1999-2004 | 2004-2007 | 2007-2009 |
|---|---|---|---|
| Балгарыя | - | - | 18 |
| Бельгія | 25 | 24 | 24 |
| Чэшская Рэспубліка | - | 24 | 24 |
| Данія | 16 | 14 | 14 |
| Германія | 99 | 99 | 99 |
| Эстонія | - | 6 | 6 |
| Грэцыя | 25 | 24 | 24 |
| Іспанія | 64 | 54 | 54 |
| Францыя | 87 | 78 | 78 |
| Ірландыя | 15 | 13 | 13 |
| Італія | 87 | 78 | 78 |
| Кіпр | - | 6 | 6 |
| Латвія | - | 9 | 9 |
| Літва | - | 13 | 13 |
| Люксембург | 6 | 6 | 6 |
| Венгрыя | - | 24 | 24 |
| Мальта | - | 5 | 5 |
| Нідэрланды | 31 | 27 | 27 |
| Аўстрыя | 21 | 18 | 18 |
| Польшча | - | 54 | 54 |
| Партугалія | 25 | 24 | 24 |
| Румынія | - | - | 36 |
| Славенія | - | 7 | 7 |
| Славакія | - | 14 | 14 |
| Фінляндыя | 16 | 14 | 14 |
| Швецыя | 22 | 19 | 19 |
| Вялікабрытанія | 87 | 78 | 78 |
| (Макс.) усяго | 626 | 732 | 786 |

Парламент звычайна праводзіць пленарныя пасяджэнні ў Страсбургу і дадатковыя - у Бруселі. Ён мае 17 камітэтаў, што рыхтуюць пленарныя пасяджэнні, і некалькі палітычных групаў, якія збіраюцца пераважна ў Бруселі. Штаб-кватэра Генеральнага сакратарыята знаходзіцца ў Люксембургу.

Парламент і Савет дзеляць між сабой заканадаўчую ўладу, выкарыстоўваючы тры адмысловыя працэдуры (акрамя простых кансультацый).

Па-першае, існуе "працэдура ўзаемадзеяння", уведзеная Адзіным еўрапейскім актам у 1986 годзе. Згодна з гэтай працэдурай парламент дае сваё заключэнне датычна праектаў дырэктыў і пастаноў, што прапануюцца Еўрапейскай камісіяй, якая можа ўнесці папраўкі ў сваю прапанову з улікам заключэння парламента.

Па-другое, існуе "пагаджальная працэдура", таксама ўсталяваная ў 1986 годзе, згодна з якой парламент мусіць даць згоду датычна міжнародных пагадненняў, наконт якіх вяла перамовы камісія, а таксама датычна любога меркаванага пашырэння Еўрапейскага саюза і шэрагу іншых пытанняў, уключна з любымі зменамі выбарчых нормаў.

Па-трэцяе, маецца "працэдура супольных рашэнняў", усталяваная Маастрыхцкім дагаворам (1992 г.). Яна ставіць парламент у роўнае становішча з Саветам датычна законатворчасці ў цэлым шэрагу важных пытанняў, уключна з вольным рухам працоўнай сілы, унутраным рынкам, адукацыяй, навукай, навакольным асяроддзем, транс'еўрапейскімі сеткамі, аховай здароўя, культурай і абаронай спажыўца. Парламент паўнамоцны адхіліць прапанаваныя заканадаўчыя акты ў гэтых галінах, калі абсалютная большасць членаў парламента прагаласуе супраць агульнай пазіцыі Савета. Аднак пытанне можа быць пастаўленае перад пагаджальным камітэтам.

Амстэрдамскі дагавор дадаў 23, а Ніццкі - яшчэ сем новых галінаў, у якіх выкарыстоўваецца працэдура супольных рашэнняў.

Парламент і Савет таксама нясуць роўную адказнасць за прыняцце бюджэту ЕС. Еўрапейская камісія дае бюджэтную прапанову, якая затым абмяркоўваецца парламентам і Саветам. Парламент можа адхіліць прапанаваны бюджэт, што ён ужо і рабіў некалькі разоў. Калі гэта здараецца, уся бюджэтная працэдура пачынаецца зноў. Парламент цалкам выкарыстоўвае свае бюджэтныя паўнамоцтвы дзеля ўплыву на палітычны працэс у ЕС. Аднак большая частка выдаткаў ЕС на сельскую гаспадарку парламентам не кантралюецца.

Парламент з'яўляецца рухаючай сілай еўрапейскай палітыкі. Гэта галоўны дыскусійны орган ЕС, месца, дзе сутыкаюцца і аб'ядноўваюцца палітычныя і нацыянальныя пазіцыі ўсіх дзяржаў ЕС. Таму зусім натуральна, што там зараджаюцца шмат якія палітычныя ініцыятывы.

Хаду парламенцкіх дэбатаў вызначаюць палітычныя групы. Найбуйнейшымі з'яўляюцца:

- Еўрапейская народная партыя (хрысціянскія дэмакраты) і Еўрапейскія дэмакраты - група ЕНП-ЕД;

- Партыя еўрапейскіх сацыялістаў - ПЕС.

Парламент адыграў ключавую ролю у падрыхтоўцы Хартыі фундаментальных правоў ЕС (абвешчанай у снежні 2000 года) і заснаванні Еўрапейскага канвента пасля пасяджэння Еўрапейскага савета ў Лекене ў снежні 2001 года.

Нарэшце, немалаважна, што парламент з'яўляецца органам, які ажыццяўляе дэмакратычны кантроль над саюзам. Ён валодае паўнамоцтвамі датычна роспуску Камісіі шляхам прыняцця прапановы пра вынясенне вотуму недаверу (гэта вымагае большасці ў дзве траціны галасоў). Ён кантралюе працэс ажыццяўлення палітыкі ЕС, напрыклад шляхам разгляду справаздач, атрыманых з Суда аўды-

тараў, і пастаноўкі вусных і пісьмовых пытанняў перад Камісіяй і Саветам. Дзейны старшыня Еўрапейскага савета таксама падсправаздачны парламенту датычна тых рашэнняў, якія прымаюцца палітычнымі лідэрамі ЕС.

У 2002 годзе старшынёй Еўрапейскага парламента быў абраны **Пэт Кокс**.

## Еўрапейская камісія

Камісія з'яўляецца адным з асноўных інстытутаў ЕС. Да 1 мая 2004 года яна складаецца з 20 членаў (па два ад Францыі, Германіі, Італіі, Іспаніі і Вялікабрытаніі і па адным ад іншых краін), што прызначаюцца на пяць гадоў згодна з пагадненнем паміж дзяржавамі ЕС, якое падлягае ўхвале парламентам.

З 1 мая 2004 года, калі новыя дзяржавы далучацца да ЕС, кожную краіну будзе прадстаўляць адзін член Камісіі.

Камісія валодае поўнай палітычнай незалежнасцю. Яе задача ў тым, каб абараняць інтарэсы ЕС увогуле, таму яна не мае права атрымліваць інструкцыі ад урадаў якіх-небудзь дзяржаў. Як захавальніца заканадаўчых актаў яна сочыць за тым, каб прынятыя Саветам і парламентам пастановы і дырэктывы ажыццяўляліся. Калі гэтага не адбываецца, то Камісія можа падаць у Еўрапейскі суд на бок, што зрабіў парушэнне, каб прымусіць яго выконваць заканадаўства ЕС.

Камісія таксама з'яўляецца адзіным інстытутам, упаўнаважаным уносіць прапановы датычна прыняцця новых заканадаўчых актаў ЕС. На любым этапе яна можа прымаць рашэнні, што спрыяюць дасягненню згоды як унутры Савета, так і між Саветам і парламентам.

У якасці выканаўчага органа ЕС Камісія выконвае рашэнні, што прымаюцца Саветам, напрыклад, датычна агульнай сельскагаспадарчай палітыкі. Камісія нясе адказнасць за пытанні забеспячэння агульнай палітыкі ЕС у такіх галінах, як навукова-даследчая дзейнасць, дапамога ў развіцці, рэгіянальная палітыка і да т.п. Акрамя таго, яна кантралюе бюджэт у гэтых галінах.

Камісія падсправаздачная парламенту. Так, яна ў поўным складзе мусіць пайсці ў адстаўку, калі парламент вынесе вотум недаверу. Менавіта пад пагрозай такога вотуму недаверу старшыня **Жак Сантэр** падаў прашэнне аб калектыўнай адстаўцы сваёй Камісіі 16 сакавіка 1999 года. На перыяд 1999-2004 гадоў старшынёй Камісіі стаў **Рамана Продзі**.

Камісіі дапамагае працаваць грамадзянская служба, што ўключае 36 генеральных дырэктаратаў (ГД) і аддзелаў, якія знаходзяцца пераважна ў Брусэлі і Люксембургу. Адрозна ад сакратарыятаў традыцыйных міжнародных арганізацый, Камісія мае ўласныя фінансавыя рэсурсы і таму можа дзейнічаць цалкам самастойна.

## Суд Еўрапейскіх супольнасцей

Суд Еўрапейскіх супольнасцей, што знаходзіцца ў Люксембургу, уключае па адным суддзі ад кожнай краіны ЕС, якім дапамагаюць восем генеральных адвакатаў. Яны прызначаюцца паводле ўзгаднення ўрадамі краін ЕС. Кожны суддзя прызначаецца на шэсць гадоў, пасля чаго можа быць зноў прызначаны яшчэ на адзін або два трохгадовыя тэрміны. Прымаючы рашэнні, суддзі мусяць быць бесстароннія.

Задача суда ў тым, каб забяспечыць выкананне заканадаўства ЕС, а таксама правільнае тлумачэнне і прымяненне пагадненняў.

Ён мае права абвінаваціць любую дзяржаву ЕС ў невыкананні сваіх дагаворных абавязкаў. Суд упаўнаважаны правяраць належнае выкананне заканадаўства ЕС і вылучаць абвінавачанне

Еўрапейскаму парламенту, Савету і Камісіі датычна непрымання неабходных захадаў.

Суд Еўрапейскіх супольнасцей таксама з'яўляецца адзіным інстытутам, які можа на просьбу нацыянальных судоў выносіць пастановы датычна тлумачэння дагавораў, а таксама юрыдычнай моцы і тлумачэння заканадаўства ЕС. Такім чынам, калі адпаведнае пытанне ўносіцца ў суд у адной з дзяржаў ЕС, гэты суд можа, а іншым разам і мусіць, запытаць пастанову Суда Еўрапейскіх супольнасцей.

Такая сістэма забяспечвае аднастайнасць тлумачэння і скарыстання заканадаўства ЕС ва ўсім Еўрапейскім саюзе.

Дагаворы недвухсэнсоўна даюць суду права правяраць, наколькі заканадаўства ЕС бярэ пад увагу фундаментальныя правы грамадзян ЕС, і прымаць пастановы ў пытаннях асабістай свабоды і бяспекі.

Суд першай інстанцыі, які заснаваны ў 1989 годзе і ўключае па адным суддзі ад кожнай дзяржавы ЕС, нясе адказнасць за прыняцце пастаноў датычна пэўных катэгорый спраў, у тым ліку - іскаў фірм і прыватных асоб да інстытутаў ЕС, а таксама спрэчак паміж гэтымі інстытутамі і іх супрацоўнікамі.

## Суд аўдытараў

Суд аўдытараў, заснаваны ў 1977 годзе, уключае па адным члене ад кожнай краіны ЕС, што прызначаюцца на шэсць гадоў паводле ўзгаднення паміж дзяржавамі ЕС і ў выніку кансультацый з Еўрапейскім парламентам. Суд аўдытараў правярае законнасць і рэгулярнасць паступленняў і выдаткавання сродкаў Еўрапейскага саюза, а таксама правільнасць выканання бюджэту ЕС. Ён мае права правяраць фінансавую справаздачнасць любой арганізацыі, што распараджаецца сродкамі ЕС, і ў пэўных выпадках перадаваць справу ў Суд Еўрапейскіх супольнасцей.

## Еўрапейскі эканамічны і сацыяльны камітэт

Прымаючы рашэнні, што закранаюць пытанні палітыкі, прадугледжаныя дагаворамі аб Еўрапейскай супольнасці і Еўраатаме, Савет і Камісія кансультуюцца з Еўрапейскім эканамічным і сацыяльным камітэтам (ЕЭСК). Яго члены прадстаўляюць розныя групы інтарэсаў, якія разам утвараюць арганізаваную грамадзянскую супольнасць, і прызначаюцца Саветам на чатыры гады.

Кансультацыі з ЕЭСК неабходныя для прыняцця рашэнняў датычна шырокага кола пытанняў (занятасць, Еўрапейскі сацыяльны фонд, прафесійная падрыхтоўка і да т.п.). На сваю ініцыятыву ён таксама можа даваць заключэнні ў іншых пытаннях, якія палічыць важнымі.

## Камітэт па пытаннях рэгіёнаў

Камітэт па пытаннях рэгіёнаў (КР), заснаваны згодна з Дагаворам аб Еўрапейскім саюзе, складаецца з прадстаўнікоў рэгіянальных і мясцовых урадаў, вылучаных дзяржавамі саюза і прызначаных Саветам на чатыры гады. Згодна з дагаворам, Савет і Камісія мусяць кансультавацца з КР у пытаннях, што закранаюць інтарэсы рэгіёнаў, а камітэт мае права даваць заключэнні на ўласную ініцыятыву.

## Еўрапейскі інвестыцыйны банк

Еўрапейскі інвестыцыйны банк (ЕІБ), штаб-кватэра якога знаходзіцца ў Люксембургу, ажыццяўляе фінансаванне праектаў дапамогі слабаразвітым рэгіёнам ЕС і павышэння канкурэнтаздольнасці малога бізнесу.

## Еўрапейскі цэнтральны банк

Еўрапейскі цэнтральны банк (ЕЦБ) са штаб-кватэрай у Франкфурце нясе адказнасць за эмісію еўра і манетарную палітыку ЕС. Яго дзейнасць болей падрабязна апісаная ў раздзеле 7.

## Еўрапейскі канвент

Інстытуты і іншыя органы, апісаныя вышэй, з'яўляюцца галоўнымі элементамі ў механізме прымання рашэнняў ЕС. Аднак дзеля таго каб ЕС мог працягваць эфектыўную працу, гэтая сістэма мае патрэбу ў пастаянным абслугоўванні. З гэтай мэтай у снежні 2001 года ў Лекене Еўрапейскім саветам быў заснаваны Еўрапейскі канвент. Яго 105 членаў пад старшынёўствам былога прэзідэнта Францыі **Валеры Жыскар д'Эстэна** рэпрэзентавалі ўрады дзяржаў ЕС і краін-кандыдатак, нацыянальныя парламенты, Еўрапейскі парламент і Еўрапейскую камісію. Задача Канвента палягала ў выпрацоўцы новага механізма кіравання Еўрапейскім саюзам пасля пашырэння.

Перад ЕС стаяць дзве галоўныя праблемы. Па-першае, у выніку пашырэння цягам наступных 10-20 гадоў агульная колькасць дзяржаў саюза вырасце да 30 або 35. Ці здолее Савет дасягаць аднагалоснасці, калі за сталом будзе сядзець столькі міністраў? Ці не стане наступствам тое, што працэс прымання рашэнняў у ЕС проста пачне спыняцца? Як стане ажыццяўляцца кіраванне саюзам? Хто будзе выступаць ад імя Еўропы на сусветнай арэне? Дзе пралягуць канчатковыя межы Еўрапейскага саюза? У рэшце рэштаў, Савет Еўропы (які не з'яўляецца інстытутам ЕС) ужо налічвае 45 дзяржаў-членаў, уключна з Расіяй, Украінай, Турцыяй і краінамі Закаўказзя.

Па-другое, грамадзяне ЕС жадаюць мець болей значны ўплыў на фарміраванне палітыкі ЕС, аднак ім цяжка разабрацца ў надзвычай складанай сістэме прымання рашэнняў ЕС, і яны ўспрымаюць "Брусель" як нешта занадта далёкае ад іх штодзённага жыцця. Адсюль вынікае, што неабходная Канстытуцыя, якая дакладна размяркоўвае сферы адказнасці ў Еўрапейскім саюзе, вызначае паўнамоцтвы і адказнасць кожнага інстытута ЕС, а таксама функцыі, якія варта пакінуць за органамі ўлады на мясцовым і нацыянальным узроўні.

ЕС неабходна вынайсці новую форму кіравання, якая была б простай, болей дэмакратычнай і набліжала б Еўропу да яе грамадзян. Таму Канвент падрыхтаваў праект Канстытуцыі, зарыентаваны на забеспячэнне гэтых патрэбаў, і рэпрэзентаваў яго Еўрапейскаму савету ў чэрвені 2003 года.

Канстытуцыя будзе мець велізарнае значэнне для будучыні саюза. Яна была асноўным прадметам дыскусій на міжурадавай канферэнцыі, што пачала працу 4 кастрычніка 2003 года, і будзе адной з галоўных тэм дэбатаў падчас кампаніі перад выбарамі ў Еўрапейскі парламент у чэрвені 2004 года.

# Курс на Еўрапейскую канстытуцыю

На пасяджэнні ў Фесалоніках 19-20 чэрвеня 2003 года Еўрапейскі савет вітаў праект канстытуцыйнага дагавора, рэпрэзентаваны старшынёй Канвента Валеры Жыскар д'Эстэнам. Палітычныя лідэры ЕС назвалі праект "добрай асновай для пачатку міжурадавай канферэнцыі" ў кастрычніку 2003 года.

У ліку іншага праект прапануе наступнае:

- старшыня Еўрапейскага савета абіраецца кваліфікаванай большасцю на два з паловай гады з магчымасцю пераабрання на адзін тэрмін;
- старшыня Камісіі абіраецца большасцю членаў Еўрапейскага парламента. Ён прапануецца Еўрапейскім саветам з улікам вынікаў выбараў у Еўрапейскі парламент;
- прызначаецца міністр замежных спраў ЕС. Ён з'яўляецца аднachасова намеснікам старшыні Еўрапейскай камісіі і членам Еўрапейскага савета;
- У дагавор павінна быць уключаная Хартыя фундаментальных правоў;
- Еўрапейскі саюз мусіць быць надзелены правамі юрыдычнай асобы;
- неабходна пашырыць кола пытанняў, у якіх Савет прымае рашэнне кваліфікаванай большасцю;
- неабходна пашырыць паўнамоцтвы Еўрапейскага парламента ў галіне заканадаўства і фінансавага планавання;
- паўнамоцтвы і адказнасць саюза і дзяржаў-членаў належыць сфармуляваць болей дакладна;
- нацыянальныя парламенты мусяць уплываць на ЕС у плане выканання прынцыпу субсідыярнасці.

# 5 Задачы саюза

Складальнікі Рымскага дагавора паставілі перад Еўрапейскай эканамічнай супольнасцю наступную задачу: *"Шляхам стварэння агульнага рынку і паступовага збліжэння эканамічнай палітыкі дзяржаў-удзельніц забяспечваць у межах Супольнасці гарманічнае развіццё эканамічнай дзейнасці, пастаяннае збалансаванае пашырэнне, рост стабільнасці, паскоранае павышэнне ўзроўню жыцця і збліжэнне дзяржаў Супольнасці".*

Гэтыя мэты ў асноўным дасягнутыя дзякуючы вольнаму руху тавараў, людзей, паслуг і капіталу, а таксама палітыцы ЕС, скіраванай на забеспячэнне справядлівай канкурэнцыі паміж кампаніямі і абарону інтарэсаў спажыўца. Стварэнне адзінага рынку завяршылася ў 1993 годзе, а еўра быў уведзены ў абарачэнне ў 2002 годзе. Аднак каб усе галіны эканомікі і рэгіёны Еўропы здолелі скарыстацца плёнам гэтых дасягненняў, яны мусяць быць падмацаваныя структурнай палітыкай, што паслядоўна і настойліва праводзіцца ў жыццё і забяспечваецца фінансаваннем з боку самога ЕС.

Палітычныя лідэры Еўропы даўно зразумелі, што еўрапейская салідарнасць азначае дзеянні дзеля ўмацавання эканамічнай і сацыяльнай інтэграцыі, іншымі словамі - скарачэння разрыву між багатымі і беднымі рэгіёнамі. На практыцы гэта азначала ўвядзенне рэгіянальнай і сацыяльнай палітыкі, і такая палітыка набывала ўсё большае значэнне з кожным наступным пашырэннем ЕС.



## Рэгіянальныя мерапрыемствы

Рэгіянальная палітыка ЕС палягае галоўным чынам ў выплатах з бюджэту ЕС на карысць маламаёмных рэгіёнаў і слаёў насельніцтва. Агульная сума асігнаванняў на 2000-2006 гады складае 213 мільярдаў еўра. Выплаты скарыстоўваюцца дзеля стымулявання развіцця адсталых рэгіёнаў, канверсіі старых прамысловых зон, дапамогі ў працаўладкаванні моладзі і тым, хто доўгі час з'яўляецца беспрацоўным, мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі і дапамогі "неперспектыўным" сельскім раёнам.

Сродкі выплачваюцца праз адмысловыя фонды: Еўрапейскі фонд рэгіянальнага развіцця (ЕФРР), Еўрапейскі сацыяльны фонд (ЕСФ), Фінансавы інструмент арыентацыі рыбалоўства і Еўрапейскі фонд арыентацыі і гарантый у галіне сельскай гаспадаркі, таксама шырока вядомы пад французскай абрэвіятурай FEOGA.

Гэтыя выплаты дапаўняюць або стымулююць інвестыцыі прыватнага сектара, а таксама нацыянальных і рэгіянальных урадаў. Каб выплаты мэтавым чынам накіроўваліся туды, дзе яны могуць прынесці найбольшы плён, ЕС паставіў тры прыярытэтныя задачы.

- Задача 1: дапамога ў развіцці рэгіёнаў, дзе кошт вырабленых матэрыяльных даброт, падзелены на колькасць насельніцтва - у тэхнічным плане вядомы як валавы ўнутраны прадукт (ВУП) на душу насельніцтва, - складае меней за 75% ад сярэдняга ў ЕС. Гэтая дапамога, дасягаючы 135 мільярдаў еўра, складае дзве траціны ўсіх сродкаў, выдзеленых на рэгіянальную палітыку на 2000-2006 гады. Яна скіроўваецца прыкладна ў 50 рэгіёнаў, дзе жыве 22% насельніцтва ЕС. Яна выкарыстоўваецца дзеля ажыўлення эканомікі гэтых рэгіёнаў праз стварэнне інфраструктуры, якой нестае, павышэнне ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі насельніцтва і заахвочванне інвестыцый у мясцовыя кампаніі.

- Задача 2: дапамога іншым рэгіёнам, што перажываюць цяжкасці. Гэта могуць быць тэрыторыі, дзе эканоміка знаходзіцца ў працэсе рэструктурызацыі, неперспектыўныя сельскія рэгіёны, крызісныя рыбалавецкія аб'яднанні ці гарадскія раёны, што зведваюць сур'ёзныя праблемы.

- Задача 3: барацьба з беспрацоўем за кошт абнаўлення сістэмы прафесійнай падрыхтоўкі і спрыяння стварэнню працоўных месцаў.

У ліку канкрэтных праграм, скіраваных на выкананне гэтых задач, - **"Інтэррэг"**, што заахвочвае прымежнае і міжрэгіянальнае супрацоўніцтва, і **"Урбан"**, што падтрымлівае ўстойлівае развіццё гарадоў і гарадскіх тэрыторый, якія перажываюць крызіс.

Дадаткова да гэтых структурных фондаў існуе Інтэграцыйны фонд. Ён выкарыстоўваецца дзеля фінансавання транспартнай інфраструктуры і праектаў ў галіне навакольнага асяроддзя ў краінах ЕС, дзе ВУП на душу насельніцтва меней за 90% ад сярэдняга ў ЕС. Дасюль краінамі-атрымальніцамі былі Грэцыя, Ірландыя, Партугалія і Іспанія.

Дзякуючы структурным схемам кшталту гэтых, фінансаваным Еўрапейскім саюзам, краінам ЕС прасцей прыводзіць свае эканомікі ў адпаведнасць адна з адной. Гэтая эканамічная канвергенцыя з'яўляецца таксама вынікам дзейнасці ўрадаў краін ЕС у справе выканання патрабаванняў эканамічнага і валютнага саюза.

## Распаўсюд структурнай палітыкі на новыя дзяржавы ЕС

Пашырэнне саюза за кошт далучэння 10 новых дзяржаў будзе ўяўляць сур'ёзную праблему для эканамічнай і сацыяльнай інтэграцыі, бо развіццё асобных рэгіёнаў гэтых краін моцна адстае ад развіцця астатняй часткі ЕС. Па сутнасці, пашырэнне зробіць саюз болей неаднародным і запатрабуе далейшых намаганняў у пытаннях галіновай і рэгіянальнай адаптацыі.

Шэраг інструментаў ужо скарыстоўваецца дзеля таго, каб дапамагчы краінам-кандыдаткам. Па-першае, існуе праграма PHARE, што размяркоўвае дапамогу такім краінам у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. За 2000-2006 гады ў межах падрыхтоўкі да ўступлення яны атрымаюць у суме 10,9 мільярда еўра.

Нарэшце, маецца **ISPA** (інструмент структурнай палітыкі да ўступлення) для фінансавання экалагічных і транспартных праектаў з бюджэтам 7,2 мільярда еўра.

Па-трэцяе, **"Сапард"** (інструмент фінансавання сельскай гаспадаркі) мае бюджэт 3,6 мільярда еўра.

Пасля ўступлення (г.зн. пасля далучэння новых дзяржаў) месца дапамогі да ўступлення зоймуць праграмы структурных фондаў і праекты Інтэграцыйнага фонду.

## Сацыяльнае вымярэнне

Мэта сацыяльнай палітыкі ЕС палягае ў ліквідацыі найболей жахлівых прыкладаў няроўнасці ў еўрапейскім грамадстве. Еўрапейскі сацыяльны фонд (ЕСФ) быў заснаваны ў 1961 годзе дзеля садзеяння стварэнню працоўных месцаў, перакваліфікацыі працаўнікоў і іх перамяшчэння з адных геаграфічных рэгіёнаў у іншыя. На 2003 год з бюджэту ЕС у ЕСФ было асігнавана 4,8 мільярда еўра.

Фінансавая дапамога - не адзіны спосаб, з дапамогай якога ЕС спрабуе палепшыць сацыяльныя ўмовы ў Еўропе. Адна толькі дапамога ніколі не магла б вырашыць ўсе праблемы, выкліканыя эканамічным спадам ці адставаннем у развіцці рэгіёнаў. Сацыяльны прагрэс з'яўляецца наступствам найперш эканамічнага росту і абумоўлены як нацыянальнай палітыкай, так і палітыкай ЕС.
Сацыяльны прагрэс, апроч таго, вымагае падтрымкі заканадаўства, што гарантуе ўсім грамадзянам ЕС шырокі спектр асноўных правоў. Асобныя з гэтых правоў замацаваныя ў дагаворах, напрыклад права мужчын і жанчын на роўную аплату працы. Іншыя ўтрымліваюцца ў дырэктывах датычна абароны працаўнікоў (ахова здароўя і бяспека на вытворчасці) і асноўных нормах бяспекі.

У снежні 1991 года пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Маастрыхце прыняло Хартыю супольнасці аб асноўных сацыяльных правах працаўнікоў, што ўстанаўлівае правы, якімі павінны карыстацца ўсе працоўныя ў ЕС: свабода перамяшчэння; справядлівая аплата працы; годныя ўмовы працы; сацыяльная абарона; права на аб'яднанні і заключэнне калектыўных дагавораў; права на прафесійную падрыхтоўку; роўнасць мужчын і жанчын; інфармацыя, кансультацыі і ўдзел працаўнікоў; ахова здароўя і тэхніка бяспекі на працоўным месцы; абарона дзяцей, старых і інвалідаў. У чэрвені 1997 года ў Амстэрдаме гэтая хартыя стала неад'емнай часткай дагавора і дзейнічае ва ўсіх краінах саюза.

## Палітыка ў галіне занятасці

На працягу апошняга дзесяцігоддзя XX стагоддзя грамадзяне ЕС сталі ўсё больш настойліва патрабаваць ад сваіх урадаў, каб тыя рабілі болей рашучыя захады ў справе стварэння працоўных месцаў. Як маглі еўрапейцы паверыць у перавагі еўрапейскай інтэграцыі і быць упэўненымі ў яе будучыні, калі беспрацоўе ахоплівала болей за 10% працоўнай сілы ЕС (да 1997 года)? Таму ў Амстэрдамскі дагавор быў уключаны новы раздзел - пра беспрацоўе, які абвясціў стварэнне працоўных месцаў прыярытэтным кірункам эканамічнай палітыкі ЕС.

На пасяджэнні Еўрапейскага савета ў Люксембургу 20-21 лістапада 1997 года лідэры 15 дзяржаў ЕС скаардынавалі стратэгію павышэння эфектыўнасці сваёй уласнай нацыянальнай палітыкі. Гэтая стратэгія прадугледжвала павышэнне ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі, дапамогу ў адкрыцці бізнесу і наладжванне сацыяльнага дыялога, г.зн. узаемадачыненняў між працадаўцамі і найманымі працаўнікамі. Яна стварала грунт для стымулявання занятасці. Дасягненні

ў ажыццяўленні гэтых кірункаў рэгулярна аналізуюцца дзяржавамі-членамі і інстытутамі ЕС на падставе ўзгодненых працэдур ацэнкі.

Люксембургская стратэгія была адшліфаваная і болей дэталёва распрацаваная на пасяджэнні Еўрапейскага савета ў Лісабоне ў сакавіку 2000 года. Яна стала Лісабонскай стратэгіяй, скіраванай на дасягненне новай, больш амбіцыйнай мэты - за дзесяцігоддзеператварыць эканоміку ЕС у *"найболей канкурэнтаздольную і дынамічную навукаёмістую эканоміку ў свеце, здольную забяспечваць рост ва ўмовах стварэння болей шматлікіх і якасных працоўных месцаў і шчыльнейшай сацыяльнай інтэграцыі"* (гл. раздзел 8 "Наперад да навукаёмістага грамадства").

## Фінансаванне агульнай палітыкі

У сакавіку 1999 года пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Берліне ўзгадніла агульную суму і характар фінансаў ЕС на перыяд 2000-2006 гадоў. Гэтае пагадненне атрымала назву "Праграма 2000". Яго задачай было забяспечыць ЕС дастатковай колькасцю грошай на рэалізацыю сваёй палітыкі і адначасова на падрыхтоўку да пашырэння.

Яно было таксама скіраванае на скарачэнне выдаткаў, каб еўрапейскія падаткаплатнікі маглі зразумець, што сродкі ЕС будуць выдаткоўвацца правільна і эфектыўна. Уласныя сродкі ЕС, галоўным чынам паступленні ад падатку на дададзеную вартасць і ад узносаў дзяржаў у залежнасці ад іх валавога нацыянальнага прадукту (ВНП), у 2000-2006 гадах не мусяць перавышаць 1,27% ВНП саюза.

Гэтая бюджэтная дысцыпліна павінна дапамагчы ЕС аплаціць выдаткі ў справе пашырэння да канца 2006 года, не ставячы пад сумнеў палітыку салідарнасці, што ўжо ажыццяўляецца, і не замінаючы саюзу ажыццяўляць новыя віды дзейнасці. Сумарны бюджэт ЕС на 2003 год меншы за 100 мільярдаў еўра, што значна ніжэй за верхнюю мяжу, вызначаную ў Берліне.

## Рэфармаванне агульнай сельскагаспадарчай палітыкі

На Берлінскім саміце падчас узгаднення палажэнняў "Праграмы 2000" Еўрапейскі савет прыняў рашэнне пра рэфармаванне агульнай палітыкі ў галіне сельскай гаспадаркі, з тым каб скараціць выдаткі і падтрымаць канкурэнтаздольнасць еўрапейскай сельскай гаспадаркі.

Задачы агульнай палітыкі ў галіне сельскай гаспадаркі, так як яны выкладзеныя ў Рымскім дагаворы, пераважна выкананыя: справядлівы ўзровень жыцця для сельскагаспадарчай супольнасці забяспечаны; рынкі стабілізаваныя; спажыўцы атрымліваюць тавары па разумных цэнах; структуры мадэрнізаваныя. Іншыя прынцыпы, прынятыя з цягам часу, таксама сябе апраўдалі. Забяспечаныя бесперабойныя дастаўкі спажыўцам, а цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю падтрымліваюцца на стабільным узроўні і абароненыя ад ваганняў сусветнага рынку.

Аднак агульная палітыка ў галіне сельскай гаспадаркі стала ахвярай уласнага поспеху. Па меры таго як агратэхніка мадэрнізавалася, а еўрапейская сельская гаспадарка ўздымала сваю канкурэнтаздольнасць, усё болей ды болей людзей пакідалі сельскую мясцовасць, і сельскагаспадарчая супольнасць у адносінах да агульнай колькасці працоўнай сілы ЕС скарацілася з 20% да меней чым 5%. Вытворчасць расла нашмат хутчэй, чым спажыванне, і бюджэту ЕС давялося трываць цяжар утылізацыі лішкаў. Акрамя таго, вытворчасць субсідавалася. У 2002 годзе субсідыі фермерскім гаспадаркам згодна з агульнай палітыкай ў галіне сельскай гаспадаркі ўсё яшчэ складалі 45,4 мільярда еўра, або 40% бюджэту Еўрапейскага саюза.

Неабходна было зрабіць крокі дзеля рэфармавання гэтай палітыкі. Вось чаму "Праграма 2000" змяніла мэты і метады агульнай палітыкі ў галіне сельскай гаспадаркі. Галоўная мэта цяпер палягала ў тым, каб заахвочваць фермераў вырабляць высакаякасную прадукцыю ў колькасці, больш адпаведнай попыту, а таксама адмаўляц-

ца ад інтэнсіўных агратэхнічных прыёмаў, што наносяць шкоду навакольнаму асяроддзю. Дапамога фермерам болей не мусіць звязвацца з аб'ёмам прадукцыі, якую яны вырабляюць.

Гэтая рэформа пачынае прыносіць плён: вытворчасць скарочаная. Еўрапейскі саюз з'яўляецца адным з вядучых сусветных экспарцёраў і імпарцёраў сельскагаспадарчай харчовай прадукцыі. Дзейная палітыка заахвочвае выкарыстанне фермерамі агратэхнічных прыёмаў, што гарантуюць бяспеку навакольнага асяроддзя і захоўваюць сельскую прыроду. Новая роля фермерскай супольнасці палягае ў тым, каб гарантаваць пэўны ўзровень эканамічнай актыўнасці ў кожным сельскім раёне і захоўваць разнастайнасць еўрапейскага ландшафту. Гэтая разнастайнасць, таксама як і прызнанне каштоўнасці сельскага ладу жыцця - гармоніі чалавека і прыроды, складае істотную частку еўрапейскай агульнасці.

Еўрапейская камісія, якая нясе адказнасць за ажыццяўленне агульнай палітыкі ў галіне сельскай гаспадаркі, мяркуе, што неабходнае далейшае збліжэнне інтарэсаў фермераў і спажыўцоў. Спажывец мае права на высакаякасную харчовую прадукцыю, цалкам адпаведную патрабаванням аховы здароўя. Бо менавіта збой палітыкі ЕС у галіне прадуктовай бяспекі і ветэрынарыі у 1990-х - пачатку 2000 гадоў дазволіў распаўсюдзіцца па Еўропе яшчуру і "каровінаму шаленству" (губкападобная энцэфалапатыя буйной рагатай жывёлы). Давялося ўвесці эмбарга на рэалізацыю прадукцыі і гандаль дзеля таго, каб спыніць іх распаўсюджванне.

У 2002 годзе Камісія прапанавала правесці далейшыя рэформы, якія б дазволілі Еўропе рабіць уплыў на нарматворчы працэс Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА). Камісія патрабуе зрабіць акцэнт на якасці прадуктаў, прынцыпе асцярожнасці і ветэрынарных захадах.

Такім самым чынам Еўрапейскі саюз распачаў рэфармаванне сваёй палітыкі ў галіне рыбалоўства. Яго мэта палягае ў скарачэнні залішняй вытворчай магутнасці рыбалоўных флатылій, захаванні рыбных запасаў і фінансавай дапамозе людзям, што пакідаюць рыбную прамысловасць.

## Устойлівае развіццё

Палітыка ЕС першапачаткова засяроджвалася на падтрымцы адзінага рынку, аднак паступова стала ахопліваць шмат якія іншыя аспекты штодзённага жыцця і вырашаць праблемы, што стаяць перад еўрапейскім грамадствам: ахова навакольнага асяроддзя, грамадская ахова здароўя, правы спажыўца, канкурэнцыя і бяспека на транспарце, адукацыя і доступ да культурных каштоўнасцей.

Каб эфектыўна вырашаць праблемы, што выходзяць за нацыянальныя межы, патрэбная ўзгодненая міжнародная сістэма захадаў. Большасць праблем прымежнага супрацоўніцтва не можа быць вырашаная без адзінага заканадаўства ЕС і фінансавання ў такім памеры, які можа забяспечыць толькі ЕС. Адгукаючыся на чаканні простых людзей, Амстэрдамскі дагавор даў Еўрапейскаму саюзу значна большыя паўнамоцтвы і адказнасць ў такіх галінах, як ахова здароўя і абарона спажыўца.

Найболей яскравым прыкладам таго, як еўрапейскія інстытуты адгукаюцца на грамадскую думку, безумоўна, з'яўляецца **ахова навакольнага асяроддзя**. Людзі асэнсавалі, што забруджванне не мае межаў, што нашы прыродныя багацці маюць патрэбу ў абароне і што кожны грамадзянін мае права на бяспечныя, здаровыя прадукты і жыццёвыя ўмовы. Такім чынам, Еўрапейскі саюз мусіў зрабіць зусім канкрэтныя захады ў цэлым шэрагу праблем: прыняцце ўнутрысаюзных стандартаў выкідаў у атмасферу; абарона азонавага слою праз скарачэнне выдзялення хлорфторвугляродаў; удасканаленне апрацоўкі сцёкавых вод і ўтылізацыя адходаў увогуле; кантроль за выкарыстаннем хімікатаў; зніжэнне ўзроўню транспартнага шуму і да т.п.

Абарона навакольнага асяроддзя не зводзіцца

толькі да болей жорсткага заканадаўства. Еўрапейскі саюз таксама фінансуе прыродаахоўныя праекты і дае бізнесу і прамысловасці фінансавую дапамогу ў выкананні еўрапейскага экалагічнага заканадаўства.

У жніўні 2002 года ў Йаханесбургу ААН наладзіла Сусветны саміт у пытаннях устойлівага развіцця. У межах падрыхтоўкі да саміту Еўрапейскі савет сабраўся ў Барселоне ў сакавіку таго ж года. Ён вызначыў дакладны прыярытэт для ЕС: зрабіць сваю палітыку ўстойлівага развіцця ўзорам для ўсяго свету. Гэтая палітыка мусіць уключаць у сябе захаванне і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, міжнародную сістэму аховы навакольнага асяроддзя, захады ў справе павышэння тэхналагічнага патэнцыялу Еўропы і актывізацыю дзейнасці ў галіне перадачы тэхналогій краінам, што развіваюцца. Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Барселоне паставіла перад ЕС задачу павялічыць афіцыйны памер дапамогі на мэты развіцця да 0,7% ад ВНП.

У сувязі з гэтым маюцца сур'ёзныя праблемы. Як можна стымуляваць эканамічны рост, жыццёва важны для краін, што развіваюцца, без урону для навакольнага асяроддзя? Як варта распараджацца воднымі рэсурсамі? Як атрымаць доступ да ўстойлівых крыніц энергіі? Як выратаваць Афрыку ад голаду і хвароб? Гэтыя праблемы таксама могуць быць больш эфектыўна вырашаныя супольнымі намаганнямі на ўзроўні ЕС, чым дзеяннямі асобных еўрапейскіх дзяржаў.

## Тэхналагічныя інавацыі

Заснавальнікі Еўрапейскага саюза слушна лічылі, што росквіт Еўропы будзе залежаць ад яе здольнасці захоўваць сусветнае тэхнічнае лідэрства. Яны бачылі перавагі, што дадуць супольныя еўрапейскія навукова-даследчыя праекты. Таму ў 1958 годзе, поруч з ЕЭС, яны стварылі Еўраатам - Еўрапейскую камісію па атамнай энергіі. Яе задача палягала ў тым, каб дапамагчы дзяржавам-удзельніцам супольна выкарыстоўваць атамную энергію ў мірных мэтах. Пры камісіі быў створаны свой Сумесны даследчы цэнтр (СДЦ), што ўключае дзевяць навукова-даследчых інстытутаў, размешчаных на чатырох аб'ектах: Іспра (Італія), Карлсруэ (Германія), Петэн (Нідэрланды) і Геел (Бельгія).

Аднак па меры таго як навукова-тэхнічны прагрэс набіраў тэмп, еўрапейскія навукова-даследчыя праграмы мусілі станавіцца болей разнастайнымі, аб'ядноўваючы навукоўцаў і навуковых работнікаў максімальна шырокага спектра ведаў. ЕС трэба было знайсці новыя спосабы фінансавання іх працы і новае прамысловае прымяненне іх адкрыццям.

Супольныя даследаванні на ўзроўні ЕС маюць на мэце дапаўняць нацыянальныя навукова-даследчыя праграмы. Яны канцэнтруюцца вакол праектаў, што аб'ядноўваюць лабараторыі розных краін ЕС. Саюз падтрымлівае фундаментальныя даследаванні ў такіх галінах, як кіраваны тэрмаядзерны сінтэз (патэнцыйна невычарпальная крыніца энергіі ў XXI стагоддзі) у межах сумеснай еўрапейскай праграмы "Торус". Ен таксама заахвочвае навуковыя даследаванні і тэхнічныя распрацоўкі ў ключавых галінах прамысловасці, такіх як электроніка і камп'ютэрная тэхніка, што сутыкаюцца з жорсткай канкурэнцыяй па-за межамі Еўропы.

У чэрвені 2002 года ЕС прыняў сваю шостую рамкавую праграму навуковых даследаванняў і тэхнічных распрацовак на 2002-2006 гады. Гэтая праграма з бюджэтам 17,5 мільярда еўра забяспечвае фінансаванне цэлага шэрагу праектаў, што аб'ядноўваюць тысячы навуковых даследчыкаў з усяго ЕС.

Звыш таго, гэтая праграма заахвочвае навуковыя даследаванні і тэхнічныя распрацоўкі ў асобных дзяржавах ЕС і павялічвае памер сродкаў, што імі расходуюцца, з 1,9 да 3% іх ВУП. Прыярытэтамі гэтай праграмы з'яўляюцца медычнабіялагічныя навукі (генетыка і біятэхналогіі), лекаванне сур'ёзных захворванняў, нанатэхналогіі, авіяцыя і касмічныя даследаванні, устойлівыя энергетычныя сістэмы, глабальныя змены навакольнага асяроддзя і экасістэмы.

# 6 Адзіны рынак

Артыкул 2 Рымскага дагавора паставіў перад Еўрапейскай эканамічнай супольнасцю такую мэту: *"Забяспечыць у маштабах усёй Супольнасці гарманічнае развіццё эканамічнай дзейнасці, бесперапыннае і збалансаванае пашырэнне, павышэнне стабільнасці, паскораны рост узроўню жыцця і збліжэнне дзяржаў, што ў яе ўваходзяць".*

Гэтай мэты можна было дасягнуць двума ўзаемадапаўняльнымі сродкамі. Па-першае, можна было адкрыць межы, забяспечыўшы вольны рух людзей, тавараў і паслуг у межах ЕЭС. Па-другое, можна было дасягнуць салідарнасці сярод дзяржаў-удзельніц, выпрацаваўшы агульную палітыку і фінансавыя інструменты.

Аб стварэнні агульнага рынку было абвешчана 1 студзеня 1993 года, але нават тады праект не быў цалкам завершаны. Чаму ж спатрэбілася болей за 40 гадоў, каб прайсці гэты шлях? У рэшце рэштаў, мытныя пошліны і тарыфы былі адменены ў ЕЭС яшчэ ў ліпені 1968 года, на 18 месяцаў раней за вызначаны тэрмін. Што ж стрымлівала працэс потым? Рэч у тым, што, па-першае, узгадніць мытныя тарыфы значна прасцей, чым сістэму падаткаабкладання. Па-другое, правілы, што рэгламентуюць прафесійную дзейнасць, маюць адметнасць у розных краінах. Па-трэцяе, на пачатку 1980-х гадоў з-за схаванага пратэкцыянізму і лішку новых тэхнічных стандартаў еўрапейскія нацыянальныя рынкі яшчэ болей аддаліліся адзін ад аднаго.



Гэта зусім не так парадаксальна, як можа здацца. Некаторыя дзяржавы-удзельніцы зведалі асабліва моцны ўдар эканамічнага спаду ў выніку двух паліўных крызісаў - 1973 і 1980 гадоў. Гэтыя краіны скарысталіся пратэкцыянісцкімі захадамі, каб абараніць свае рынкі ад балючага ціску ўсё большай сусветнай канкурэнцыі.

Але вось у 1985 годзе, пры старшыні Жаку Дэлоры, Камісія надрукавала "Белую кнігу", што выклікала сапраўдную сенсацыю. У кнізе казалася пра тое, што супольнасць, якая пашыраецца, мае патэнцыйную магчымасць стаць адзіным рынкам, што абслугоўвае болей за 300 мільёнаў спажыўцоў. Адначасова кніга недвухсэнсоўна паказвала, што велізарны патэнцыял стрымліваецца шмат якімі перашкодамі: чэргамі на памежных пунктах, тэхнічнымі бар'ерамі на шляху гандлю, рынкамі, што зачыненыя для дзяржаўных заказаў... Выдаткі такой неэфектыўнасці - "выдаткі не-Еўропы", як гэта сталі называць, - ацэньваліся прыблізна ў 200 мільярдаў еўра.

"Белая кніга" падштурхнула 12 дзяржаў-удзельніц да дзеяння. У лютым 1986 года яны падпісалі Адзіны еўрапейскі акт, які вызначыў спіс з прыкладна 270 мерапрыемстваў, неабходных дзеля стварэння адзінага рынку да 1993 года, і тэрміны іх выканання. Наступны прагрэс быў хуткі. Кампаніі, прафесійныя супольнасці і прафсаюзы тэрмінова зрабілі захады ў мэтах прыстасавання сваёй стратэгіі да новых правілаў гульні. Выгады для штодзённага жыцця не прымусілі сябе доўга чакаць, што адлюстравалася ў з'яўленні шырокага спектра тавараў і паслуг і магчымасці вольнага руху па Еўропе як дзеля працы, так і дзеля адпачынку.

Гэтае "магічнае кола" ўсё большай свабоды руху, канкурэнтаздольнасці і эканамічнага росту стала незваротна пашырацца. Фізічныя, падатковыя і тэхнічныя перашкоды разбураюцца адна за адной, хаця застаюцца рознагалоссі датычна пэўных найболей далікатных тэмаў, такіх як гарманізацыя падаткаў на зберажэнні.

Каб тавары, паслугі, людзі і фінансы маглі вольна рухацца ў межах аднаго рынку, неабходныя правілы, што забяспечваюць справядлівую канкурэнцыю. Гэтыя правілы ўстаноўленыя ў Дагаворы аб ЕС. Напрыклад, дагавор забараняе любыя дзелавыя пагадненні, "аб'ектам або вынікам якіх з'яўляецца перашкода правілам канкурэнцыі на агульным рынку, іх абмежаванне або парушэнне" (артыкул 81). Дагавор таксама забараняе "любое злоўжыванне з боку аднаго або некалькіх прадпрыемстваў становішчам дамінавання на агульным рынку" (артыкул 82).

Еўрапейская камісія адыгрывае ключавую ролю ў забеспячэнні выканання гэтых правілаў. Яна мае права накладаць штрафы на любую фірму або краіну ЕС, што парушаюць правілы. Паўнамоцтвы Камісіі ў гэтай галіне настолькі шырокія, што яна фактычна можа забараніць аперацыю, пагадненне аб якой дасягнутае кампаніямі па-за межамі ЕС, калі гэтая аперацыя можа зрабіць неспрыяльнае ўздзеянне на агульны рынак. Акрамя таго, Камісія кантралюе дзяржаўную дапамогу (г.зн. дапамогу, што даецца кампаніям урадамі краін ЕС).

## Становішча спраў

Увогуле поспехі пакуль што былі вельмі задавальняючыя:

- адкрытыя нацыянальныя рынкі дзяржаўных заказаў дзякуючы болей жорсткім правілам, што вымагаюць празрыстасці працэдур заключэння і праверак дзяржаўных заказаў на працы і паслугі;
- неадпаведнасці нацыянальных падатковых сістэм згладжаныя прыняццем шэрагу агульных правіл, датычных ускоснага падаткаабкладання, падатку на дададзеную вартасць (ПДВ) і акцызаў;
- рынкі фінансаў і фінансавых паслуг лібералізаваныя;
- зробленыя крокі да гарманізацыі нацыянальнага заканадаўства аб бяспецы і забруджванні навакольнага асяроддзя, а ў больш агульным плане краіны ЕС пагадзіліся на ўзаемнае прызнанне аднастайнасці сваіх заканадаўстваў і сістэм сертыфікацыі;
- знятыя перашкоды для вольнага руху людзей: пашпартныя праверкі на большасці ўнутраных межаў ЕС адмененыя, і краіны ЕС узаемна прызналі прафесійную кваліфікацыю. Напрыклад, дырэктыва, прынятая ў лістападзе 1997 года, аблегчыла юрыдычную практыку ва ўсім Еўрапейскім саюзе;
- прыведзеныя ў адпаведнасць нацыянальныя заканадаўствы аб кампаніях і правах інтэлектуальнай і прамысловай уласнасці (гандлёвыя маркі і патэнты). Гэта стварыла нашмат спрыяльнейшае асяроддзе для прамысловай кааперацыі.

Аднак свабода руху застаецца далёка не поўнай. Усё яшчэ існуе мноства перашкод для пераезду ў іншыя краіны ЕС і занятку там пэўнымі відамі працы. Камісія зрабіла захады дзеля павышэння мабільнасці працоўнай сілы. Напрыклад, яна гарантавала, што дыпломы аб адукацыі і прафесійная падрыхтоўка, атрыманыя ў адной з краін ЕС, прызнаюцца ў астатніх.

Адзіны рынак, безумоўна, існуе і працуе, аднак застаецца яшчэ шмат няскончанай працы, ды і ўвогуле няма мяжы для дасканаласці. Увядзенне еўра спрыяльна паўплывала на празрыстасць рынку і канкурэнцыю: з 1 студзеня 2002 года пакупнікі, што маюць гэтую валюту ў партаманетах, атрымліваюць мажлівасць хадзіць па крамах, непасрэдна параўноўваючы цэны ў дзесятку краін ЕС.

## Няскончаная праца

Галоўнай крыніцай дабрабыту Еўрапейскага саюза з'яўляецца сфера паслуг, якая знаходзіцца ў працэсе лібералізацыі, хаця адны сектары адкрываюцца хутчэй за іншыя.

Лібералізацыя сектара **тэлекамунікацый** ужо прывяла да істотнага зніжэння цэн. Пры канцы 2001 года міжгародні тэлефанаванні былі ў сярэднім на 11% таннейшыя, чым як у 2000 годзе, і на 45% таннейшыя, чым як у 1998-м.

Робяцца крокі да стварэння рэальнага адзінага рынку **прыроднага газу** і **электраэнергіі**, аднак увогуле пытанне продажу энергіі застаецца надта далікатным. Рынак мусіць забяспечыць доступ усіх спажыўцоў да надзейных даставак энергіі па прымальных цэнах.

У лістападзе 2000 года Камісія надрукавала дыскусійны дакумент ("Зялёная кніга"), які задае кірунак агульнаеўрапейскай энергетычнай палітыцы, заснаванай на сістэме крыніц энергіі і здольнай забяспечыць бесперапынныя дастаўкі. Калі ЕС не зробіць захадаў у гэтым пытанні, праз 20-30 гадоў давядзецца імпартаваць ужо 70% энергетычных рэсурсаў, а не 50%, як цяпер. Ужо зараз ён на 45% залежыць ад Блізкага Усходу ў пытанні імпарту нафты і

на 40% ад Расіі ў пытанні імпарту прыроднага газу.
Акрамя таго, краіны ЕС у плане энергарэсурсаў залежаць адна ад адной і ўзялі ўзаемныя абавязкі наконт зніжэння выкідаў парніковых газаў у атмасферу, каб прадухіліць змены клімату. Адной з задач ЕС з'яўляецца распрацоўка новых і ўзнаўляльных энергарэсурсаў (у тым ліку біяпаліва), з тым каб да 2010 года доля гэтых чыстых крыніц энергіі ў сумарных энергарэсурсах ЕС павялічылася ўдвая - з 6% да 12%.

Адным з галоўных сродкаў ашчаджэння энергіі ў ЕС, а таксама паляпшэння навакольнага асяроддзя, з'яўляецца **транспартная палітыка**. Зараз прыкладна 50% тавараў і 80% пасажыраў у Еўропе перавозяцца аўтамабільным транспартам. Гэта цягне за сабой не толькі вялікі расход энергіі, але і дарожныя заторы, а таксама наносіць урон навакольнаму асяроддзю. У асобных гарадскіх раёнах рух фактычна паралізаваны, а забруджанне атмасферы дасягнула пагражальнага ўзроўню. Каб паспрыяць вырашэнню гэтай праблемы, ЕС плануе перанесці як мага болей грузавых перавозак з аўтадарог на чыгункі і водныя шляхі.

ЕС мае патрэбу ў транспартнай палітыцы, якая забяспечыла б найбольшую мабільнасць як людзей, так і грузаў на абсягу яго пазбаўленага межаў адзінага рынку. З гэтай прычыны чыгуначны транспарт у Еўропе мусіць быць цалкам лібералізаваны. Гэта азначае прывядзенне ў адпаведнасць тэхнічных стандартаў, што рэгулююць выкарыстанне еўрапейскіх чыгунак, і прадастаўленне кампаніям-канкурэнтам доступу да нацыянальных чыгуначных сетак.

Паветраны транспарт таксама мае патрэбу ў мадэрнізацыі. Штодня неба над Еўропай перасякаюць 25 000 самалётаў, якія суправаджае мноства нацыянальных сістэм кіравання паветраным рухам (КПР). Гэта выклікае перагрузку трас, затрымку рэйсаў і псуе нервы пасажырам. Камісія прапануе аб'яднаць сістэмы КПР і стварыць "адзінае еўрапейскае неба".

Пад ціскам Камісіі і парламента паштовыя службы ЕС таксама адкрываюцца для канкурэнцыі. Гэта ставіць на парадак дня прынцыповае пытанне пра паслугі агульнага карыстання. Дагавор аб Еўрапейскім саюзе прызнае важнасць грамадскіх паслуг, якія адзін толькі рынак не ў стане забяспечыць. Кожны мусіць мець доступ да асноўных паслуг (такіх як вода- і электразабеспячэнне, ахова здароўя, пошта і да т.п.) па даступных коштах. Па сутнасці, такі доступ неабходны дзеля эканамічнай і сацыяльнай інтэграцыі ЕС. Таму ўстановы ЕС рыхтуюць заканадаўства, каб пазбегнуць супярэчнасцей паміж палажэннямі Дагавора аб канкурэнцыі ў межах агульнага рынку і неабходнасцю падтрымліваць паслугі агульнага карыстання на высокім узроўні. Усё гэта з'яўляецца часткай захадаў Еўрапейскага саюза дзеля стварэння для сваіх грамадзян мадэлі грамадства, што валодае еўрапейскай адметнасцю.

Праца над фарміраваннем адзінага рынку зараз сканцэнтраваная на сектарах паслуг, што ў асобных краінах традыцыйна з'яўляюцца полем дзейнасці нацыянальных падрадчыкаў. Адкрыццё іх для канкурэнцыі мусіць садзейнічаць стварэнню працоўных месцаў і ўмацаванню еўрапейскай эканомікі.

# 7 Эканамічны і валютны саюз. Еўра

З 1 студзеня 2002 года больш за 300 мільёнаў еўрапейскіх грамадзян выкарыстоўваюць еўра як звычайны элемент штодзённага жыцця. Спатрэбілася толькі 10 гадоў, каб прайсці шлях ад Маастрыхцкага дагавора (люты 1992 года), што замацаваў прынцып адзінай еўрапейскай валюты, да дня, калі банкноты і манеты еўра трапілі ў абарачэнне ў 12 краінах ЕС. Гэта беспрэцэдэнтна кароткі тэрмін, каб ажыццявіць унікальную для сусветнай гісторыі аперацыю.

Еўра замяніў валюты, што былі для многіх краін шматвекавымі сімваламі, інструментамі нацыянальнага суверэнітэту. Пры гэтым новая валюта істотна прасунула Еўропу ў кірунку эканамічнага саюза. Гэта таксама дало грамадзянам ЕС нашмат болей выразнае асэнсаванне агульнай еўрапейскай прыналежнасці. Маючы ў кішэні еўра, можна вандраваць і рабіць пакупкі ў большасці краін саюза без патрэбы мяняць грошы.



Як жа зарадзілася ідэя адзінай еўрапейскай валюты? Яшчэ ў 1970 годзе ў дакладзе Вернера, названым так паводле імя тагачаснага прэм'ер-міністра Люксембурга, было прапанавана зблізіць эканомікі і валюты шасці краін ЕЭС. Першы крок у гэтым кірунку быў зроблены толькі ў сакавіку 1979 года, калі была створаная Еўрапейская валютная сістэма (ЕВС). ЕВС мела на мэце скараціць дыспрапорцыі абменных курсаў валют дзяржаў-удзельніц. Яна ўсталявала межы іх вагання ад 2,25 да 6%. Аднак яе эфект быў аслаблены серыяй крызісаў, выкліканых нестабільнасцю долара ЗША і слабасцю асобных валют, якія станавіліся ахвярай спекулянтаў, асабліва ў перыяды міжнароднай напружанасці.

Патрэба ў зоне валютнай стабільнасці адчувалася ўсё мацней па меры таго, як Еўропа прасоўвалася да канчатковага афармлення адзінага рынку. Адзіны еўрапейскі акт, падпісаны ў лютым 1986 года, лагічна меў на ўвазе збліжэнне эканомік еўрапейскіх краін і неабходнасць абмежаваць ваганні абменных курсаў іх валют. Як можна было чакаць дакладнай працы адзінага рынку, заснаванага на вольным руху людзей, тавараў і капіталу, калі валюты, што цыркулююць на гэтым рынку, могуць быць дэвальваваныя? Дэвальвацыя валюты дала б ёй непарытэтную канкурэнтную перавагу і прывяла б да парушэння гандлю.

У чэрвені 1989 года на пасяджэнні Еўрапейскага савета ў Мадрыдзе старшыня Камісіі Жак Дэлор прапанаваў план і графік стварэння эканамічнага і валютнага саюза (ЭВС). Гэты план быў потым замацаваны ў дагаворы, падпісаным у Маастрыхце ў лютым 1992 года. Дагавор ўсталяваў сістэму крытэрыяў, якім павінны адпавядаць дзяржавы-удзельніцы, каб быць прынятымі ў ЭВС. Усе гэтыя крытэрыі тычыліся эканамічнай і фінансавай дысцыпліны: стрымліванне інфляцыі, зніжэнне працэнтных ставак, скарачэнне бюджэтнага дэфіцыту максімум да 3% ВУП, абмежаванне дзяржаўнага запазычвання максімум да 60% ВУП і стабілізацыя абменнага курсу валют.

У пратаколах, прыкладзеных да дагавора, Данія і Вялікабрытанія пакінулі за сабой права не пераходзіць да трэцяга этапа ЭВС (г.зн. увядзення еўра) нават пры адпаведнасці згаданым крытэрыям. Гэта было названа "выбарам". Пасля рэферэндуму Данія абвясціла, што не мае намеру ўводзіць еўра. Швецыя таксама ўстрымалася.

Неабходна было знайсці спосаб забяспечыць стабільнасць адзінай валюты, паколькі інфляцыя зніжае канкурэнтаздольнасць эканомікі, давер людзей і іх пакупную здольнасць. Таму быў заснаваны незалежны Еўрапейскі цэнтральны банк (ЕЦБ) са штаб-кватэрай у Франкфурце, перад якім была пастаўлена задача вызначаць працэнтныя стаўкі ў мэтах падтрымання кошту еўра.

У чэрвені 1997 года ў Амстэрдаме Еўрапейскі саюз прыняў дзве важныя рэзалюцыі.

- Першая, вядомая як Пакт стабільнасці і росту, абавязвала краіны-удзельніцы захоўваць бюджэтную дысцыпліну. Яны мусяць пільна кантраляваць адна адну і не дапускаць раздзімання бюджэтных дэфіцытаў.

- Другая рэзалюцыя тычылася эканамічнага росту. Яна абвясціла, што дзяржавы-удзельніцы і Камісія цвёрда прытрымліваюцца таго прынцыпу, што праблема занятасці ўзначальвае спіс праблем, якія стаяць перад ЕС.

У снежні 1997 года ў Люксембургу Еўрапейскі савет прыняў яшчэ адну рэзалюцыю - датычна каардынацыі эканамічнай палітыкі.

Яна прадугледжвае важнае рашэнне аб тым, што "міністры краін, якія ўваходзяць у зону еўра, могуць сустракацца ў нефармальнай абстаноўцы, каб абмеркаваць пытанні, што тычацца абавязкаў іх краін у межах падзелу адказнасці за адзіную валюту". Такім чынам, палітычныя лідэры ЕС праклалі шлях да яшчэ болей цесных сувязей паміж краінамі, што прынялі еўра, - сувязей, якія выходзяць за межы валютнага саюза і ахопліваюць пытанні фінансавай, бюджэтнай, сацыяльнай і падатковай палітыкі.

Поспехі ў стварэнні ЭВС спрасцілі адкрыццё і канчатковае афармленне адзінага рынку. Нягледзячы на неспакойную сітуацыю ў свеце (крызісы на фондавым рынку, атакі тэрарыстаў і вайна ў Іраку), зона еўра характарызуецца дастатковай стабільнасцю і прадказальнасцю, што так патрэбна спажыўцам. Даверу еўрапейскіх грамадзян да еўра таксама спрыяла паспяховае і нечакана хуткае ўвядзенне манет і банкнот у першай палове 2002 года. Людзям падабаецца, што рабіць усюды пакупкі стала прасцей, і зараз яны могуць непасрэдна параўноўваць кошты ў еўрапейскіх краінах.

Еўра стаў другой паводле значнасці сусветнай валютай. Ён усё часцей выкарыстоўваецца ў міжнародных разліках і ў якасці рэзервовай валюты паралельна з доларам ЗША. Інтэграцыя фінансавых рынкаў зоны еўра атрымала паскарэнне, пры гэтым назіраецца зліццё не толькі фірмаў, што вядуць аперацыі з фондавымі паперамі, але і фондавых біржаў. План захадаў ЕС ў справе фінансавых паслуг мусіць быць ажыццёўлены да 2005 года.

# Паэтапнае ўвядзенне еўра

***7 лютага 1992 года:*** падпісанне Маастрыхцкага дагавора

Пагадненне датычна Дагавора аб Еўрапейскім саюзе і эканамічным і валютным саюзе (ЭВС) было дасягнутае ў Маастрыхце ў снежні 1991 года. Яно было падпісанае ў лютым 1992 года і набывае моц у лістападзе 1993-га. Згодна з гэтым дагаворам, нацыянальныя валюты будуць замененыя адзінай еўрапейскай валютай пры ўмове, што краіны-удзельніцы адпавядаюць шэрагу эканамічных умоў. Найбольш важным з маастрыхцкіх крытэрыяў з'яўляецца патрабаванне, каб бюджэтны дэфіцыт краіны не перавышаў 3% яе валавога ўнутранага прадукту (ВУП) на працягу параўнальна кароткага прамежку часу. Дзяржаўныя запазычванні не мусяць перавышаць 60% ВУП. Цэны і працэнтныя стаўкі мусяць заставацца стабільнымі цягам доўгага перыяду, таксама як і курсы абмену адпаведных валют.

***Студзень 1994 года:*** заснаванне Еўрапейскага валютнага інстытута

Заснаваны Еўрапейскі валютны інстытут (ЕВІ) і ўведзеныя новыя працэдуры назірання за эканамічнымі сістэмамі краін ЕС і стымулявання іх збліжэння.

***Чэрвень 1997 года:*** Пакт стабільнасці і росту

Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Амстэрдаме дасягнула пагаднення пра Пакт стабільнасці і росту, а таксама пра новы механізм усталявання абменных курсаў (адраджэнне Еўрапейскай валютнай сістэмы), што маюць на мэце стабілізацыю курсу еўра адносна валютаў краін ЕС, якія не ўвайшлі ў зону еўра. Таксама ўзгоднены дызайн "еўрапейскага" боку манет еўра.

***Май 1998 года:*** 11 краін адпавядаюць патрабаванням для ўвядзення еўра

На сустрэчы ў Бруселі 1-3 мая 1998 года палітычныя лідэры саюза вырашылі, што 11 краін ЕС адпавядаюць патрабаванням да ўдзельнікаў зоны еўра. Абвешчаныя канчатковыя курсы абмену валют зоны.

***1 студзеня 1999 года:*** нараджэнне еўра

1 студзеня 1999 года 11 валют краін-удзельніц спынілі існаванне і былі замененыя еўра, які стаў такім чынам агульнай валютай Аўстрыі, Бельгіі, Фінляндыі, Францыі, Германіі, Ірландыі, Італіі, Люксембурга, Нідэрландаў, Партугаліі і Іспаніі (Грэцыя далучылася 1 студзеня 2001 года). Ад гэтай даты Еўрапейскі цэнтральны банк прымае на сябе функцыі ЕВІ і нясе адказнасць за валютна-крэдытную палітыку, якая распрацоўваецца і ажыццяўляецца ў еўра. Абменныя аперацыі ў еўра пачынаюцца 4 студзеня 1999 года паводле курсу прыблізна 1 еўра за 1,18 долара ЗША. Гэтым адзначаны пачатак пераходнага перыяду, які будзе доўжыцца да 31 снежня 2001 года.

***1 студзеня 2002 года:*** увядзенне манет і банкнот еўра

1 студзеня 2002 года банкноты і манеты еўра ўведзены ў абарачэнне. Гэта пачатак перыяду, на працягу якога банкноты і манеты нацыянальных валют будуць выключацца з абарачэння. Перыяд скончыўся 28 лютага 2002 года. Пасля гэтай даты толькі еўра стаў афіцыйнай валютай краін зоны еўра.

# 8 Наперад да навукаёмістага грамадства

На пачатку апошняга дзесяцігоддзя XX стагоддзя з'явіліся два істотныя фактары, што сталі ўплываць на эканоміку і лад жыцця ў глабальным маштабе, а таксама ў Еўропе. Першым фактарам была глабалізацыя: па меры таго як эканамічныя сістэмы свету станавіліся ўсё болей узаемазалежнымі, нараджалася глабальная эканоміка. Другі фактар палягаў у тэхналагічнай рэвалюцыі - з'яўленні Інтэрнета, а таксама новых інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій.

Тэхналагічная рэвалюцыя зарадзілася ў ЗША, і іх эканоміка ад гэтага пераважна выйграла. Вядзенне бізнесу праз Інтэрнет істотна падняло эфектыўнасць і прадукцыйнасць амерыканскіх кампаній. За 1995-2001 гады эканамічны рост ЗША складаў у сярэднім 3,6% штогод, што істотна перавышала сярэднегадавы еўрапейскі паказчык за той самы перыяд - 2,4%. У Еўропе ВУП на душу насельніцтва складае толькі 69% ад узроўню ЗША, а сярэдняя прадукцыйнасць працы роўная 78% ад амерыканскага паказчыка.



На мяжы 2000 года лідэры ЕС выразна ўсведамлялі, што эканоміка ЕС мае патрэбу ў глыбокай мадэрнізацыі, каб быць здольнай канкурыраваць з эканомікай ЗША і іншых буйных ўдзельнікаў сусветнага рынку. На пасяджэнні ў Лісабоне ў сакавіку таго самага года Еўрапейскі савет паставіў перад ЕС новую і вельмі амбіцыйную задачу: на працягу дзесяцігоддзя стварыць *"найболей канкурэнтаздольную і дынамічную эканоміку ў свеце, заснаваную на навукаёмістых тэхналогіях, здольную забяспечваць устойлівы рост, ствараючы новыя працоўныя месцы болей высокай якасці і развіваючы сацыяльную інтэграцыю"*.

Лідэры ЕС таксама дэталёва ўзгаднілі стратэгію дасягнення гэтай мэты. Лісабонская стратэгія закранае такія пытанні, як навуковыя даследаванні, адукацыя, прафесійная падрыхтоўка, доступ у Інтэрнет і інтэрактыўнае вядзенне бізнесу. Яна таксама прадугледжвае рэфармаванне еўрапейскіх сістэм сацыяльнай абароны. Гэтыя сістэмы ўяўляюць сабой адзін з найвялікшых здабыткаў Еўропы: яны дазваляюць нашым грамадствам перажываць змены параўнальна бязбольна. Аднак яны мусяць стаць болей жыццяздольнымі, каб і наступныя пакаленні здолелі скарыстацца іх перавагамі.

Нарады Еўрапейскага саюза, на якіх разглядаецца хада ажыццяўлення Лісабонскай стратэгіі, ладзяцца кожную вясну.

На патрабаванне Савета Камісія вылучыла план дзеянняў, які атрымаў назву **"Электронная Еўропа 2005"** і мэтай якога з'яўляецца актывізацыя выкарыстання Інтэрнета ў Еўрапейскім саюзе. Да 2005 года ў Еўропы мусяць быць сучасныя, інтэрактыўныя грамадскія службы, што ахопліваюць дзейнасць урада, прафесійную падрыхтоўку і ахову здароўя. Паўсюдна карыстальнікі мусяць мець доступ па канкурэнтаздольных коштах да тэхналогій шырокапалоснай інфраструктуры. Іншымі словамі, у іх павінна быць магчымасць дасылаць звесткі па лініях хуткаснай перадачы інфармацыі і спадарожнікавых каналах з упэўненасцю, што захоўваецца таямніца іх паведамленняў.

Шмат што належыць зрабіць, каб Еўропа здолела цалкам выкарыстоўваць патэнцыял лічбавых тэхналогій, забяспечыць сваім кампаніям і грамадзянам доступ да танных камунікацыйных сетак высокага класа, а таксама да шырокага спектра інтэрактыўных паслуг. Напрыклад, усе школы Еўрапейскага саюза павінны валодаць доступам у Інтэрнет, а выкладчыкі - мець падрыхтоўку для яго выкарыстання. Неабходнае еўрапейскае заканадаўства, што рэгулюе электронны гандаль, а таксама такія пытанні, як правы інтэлектуальнай уласнасці, электронныя плацяжы і інтэрактыўнае прадастаўленне фінансавых паслуг.

Адна з задач, датычна якіх было дамоўлена ў Лісабоне, палягае ў стварэнні **"Еўрапейскай сферы даследаванняў"**. Гэта прадугледжвае, у прыватнасці, стварэнне высакахуткаснай транс'еўрапейскай сеткі электроннай навуковай сувязі, якая злучыла б універсітэты і навукова-даследчыя інстытуты Еўропы, яе навуковыя бібліятэкі, а з цягам часу і школы. Акрамя таго, робяцца захады дзеля скасавання бар'ераў, што замінаюць вольнаму руху навуковых работнікаў па Еўропе. Адначасова неабходныя стымулы, каб вядучыя навукоўцы свету ехалі працаваць у Еўропу і заставаліся тут.

**Малыя і сярэднія прадпрыемствы (МСП)** складаюць падмурак еўрапейскай эканомікі. Занадта часта іх канкурэнтаздольнасці і дынаміцы перашкаджаюць паспешліва прынятыя правілы і загады, неаднолькавыя ў розных краінах. Сярод іншага, Лісабонская стратэгія прадугледжвае распрацоўку заканадаўства аб малым бізнесе і прадастаўленне прадпрымальнікам капіталу, неабходнага, каб адкрываць прадпрыемствы з выкарыстаннем высокіх тэхналогій.

Адзін з прыярытэтаў ЕС - актывізацыя інвестыцый **у чалавечыя рэсурсы і прафесійную падрыхтоўку**, што з'яўляюцца асноўнымі актывамі Еўропы. Еўрапейскі саюз прызнае важнасць адукацыі і бесперапыннага ўдасканалення ведаў на працягу жыцця, неабходнасці валодаць некалькімі мовамі і тэхнічнымі навыкамі. Недахоп кваліфікаванага персаналу стрымлівае еўрапейскія тэлекамунікацыйныя і інтэрнэтпаслугі.

Праз такія праграмы, як "Сакрат", "Леанарда" і Моладзевая праграма, Еўрапейскі саюз спрыяе вольнаму руху студэнтаў, выкладчыкаў і навукова-даследчых работнікаў па Еўропе. Ён таксама робіць захады дзеля таго, каб час навучання ў любой краіне ЕС і атрыманая там кваліфікацыя залічваліся ва ўсіх астатніх краінах.

Нарэшце, Лісабонская стратэгія прадугледжвае вырашэнне найболей цяжкавырашальнай праблемы Еўропы - **старэння яе насельніцтва** і тых сур'ёзных наступстваў, якія яна мае для працоўнай сілы і фінансавання еўрапейскіх праграм **сацыяльнага і пенсійнага забеспячэння.** У Еўропе адчуваецца недахоп працоўнай сілы, асабліва жанчын і людзей старэйшых узроставых груп. Разам з тым беспрацоўе ў асобных рэгіёнах ЕС мае пастаянны характар, а увогуле вызначаецца шырокім рэгіянальным ваганнем паказчыкаў.

Таму пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Лісабоне паставіла задачу ўзняць узровень занятасці ў сярэднім з 61% у 2000 годзе да 70% у 2010-м і павялічыць долю працоўных жанчын з 51% да 60% за той самы перыяд.

Каб вырашыць праблему старэння насельніцтва і яго наступстваў для краін Еўропы, пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Барселоне ў сакавіку 2002 года заклікала еўрапейскія ўрады скараціць *"дапамогу ў сувязі з дачасным выхадам на пенсію, а таксама карпаратыўныя праграмы датэрміновага выхаду на пенсію". Да 2010 года мяркуецца "прагрэсіўнае павышэнне прыкладна на пяць гадоў прадугледжанага законам сярэдняга пенсійнага ўзросту ў Еўрапейскім саюзе".*

# 9 Грамадзянская Еўропа

Што знаходзіцца ў аснове асноў еўрапейскай палітыкі - людзі або бізнес? Працэс аб'яднання Еўропы пачаўся з палітычнай канцэпцыі бацькоў-заснавальнікаў ЕС. Іх галоўным клопатам было зрабіць так, каб войны болей ніколі не раздзіралі Еўропу, як гэта доўжылася стагоддзямі. Але каб пабудаваць аб'яднаную Еўропу як мага болей эфектыўна і надзейна, яны ўзброіліся прагматычным падыходам, што палягаў у стварэнні еўрапейскай салідарнасці ў вельмі прагматычных галінах: вугаль і сталь, адзіны рынак, сельскагаспадарчая палітыка, канкурэнцыя...

Так нарадзілася Еўропа, якую хто-ніхто ахрысціў тэхнакратычнай, паколькі дзеля функцыянавання ёй патрэбныя эксперты, эканамісты і дзяржаўныя службоўцы.
Магчыма, яна і тэхнакратычная, аднак першапачатковая ідэя не ажыццявілася б, калі б не падмацоўвалася палітычнай воляй еўрапейскіх інстытутаў.



## Еўропа ў штодзённым жыцці

Большасць задач, пастаўленых дагаворамі, зараз ужо выкананыя. Засталіся ў мінулым старыя законы і загады, падатковыя і мытныя бар'еры, што некалі абмяжоўвалі чалавечую дзейнасць у Еўропе і заміналі вольнаму руху тавараў, капіталу і паслуг. Хоць мы не заўсёды асэнсоўваем гэта, кожны з нас у штодзённым жыцці карыстаецца дабротамі адзінага рынку: шырокім выбарам спажывецкіх тавараў і прадуктаў; цэнамі, якім не дае расці канкурэнцыя; палітыкай абароны спажыўца і навакольнага асяроддзя; тэхнічнымі стандартамі, што уніфікуюцца ў кірунку гарманічнага павышэння.

Падобным жа чынам людзі, якія жывуць у аддаленых рэгіёнах Еўропы, карыстаюцца дабротамі, што забяспечваюцца праз структурныя фонды, такія як Еўрапейскі фонд рэгіянальнага развіцця. Еўрапейскія фермеры на працягу дзесяцігоддзяў атрымліваюць перавагі з механізма падтрымання цэн Еўрапейскага фонду арыентацыі і гарантый у галіне сельскай гаспадаркі.

Амаль што ўсе бюджэтныя выдаткі ЕС, якія склалі ў 2003 годзе прыблізна 100 мільярдаў еўра, накіроўваюцца на захады, што непасрэдна ўздзейнічаюць на штодзённае жыццё грамадзян Еўропы.

Як толькі Рымскі дагавор набыў сілу ў 1958 годзе, еўрапейскія заканадаўцы распачалі працу над законамі, што гарантавалі б вольны рух працоўнай сілы, свабоду паслуг і права прафесійнай практыкі. Такім чынам, кожны грамадзянін ЕС незалежна ад грамадзянства вольны шукаць працу ў любой краіне саюза. Дыскрымінацыя паводле нацыянальнай прыналежнасці забароненая. Дырэктывы ЕС усталявалі адзіныя правілы, што рэгулююць прафесійную практыку ў саюзе. Была зробленая карпатлівая праца ў пытанні уніфікацыі заканадаўства з тым, каб кваліфікацыя доктара, адваката, медыцынскай сястры, ветэрынарнага лекара, хіміка, архітэктара, страхавога агента і да т.п., атрыманая ў любой краіне ЕС, прызнавалася ва ўсіх астатніх.

Аднак яшчэ столькі галін дзейнасці рэгулявалася нацыянальнымі нормамі, што 21 снежня 1988 года дзяржавы - удзельніцы ЕС прынялі дырэктыву, якая ўсталявала сістэму ўзаемнага прызнання дыпломаў аб вышэйшай адукацыі. Гэтая дырэктыва тычыцца ўсіх універсітэцкіх курсаў працягласцю не меней за тры гады і грунтуецца на прынцыпе ўзаемнага даверу паміж нацыянальнымі сістэмамі адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі.

Такім чынам, першаступенным правам грамадзяніна Еўропы з'яўляецца права на перамяшчэнне, працу і жыццё ў любым месцы саюза. Маастрыхцкі дагавор замацаваў гэтае права ў раздзеле, прысвечаным грамадзянству.

За выключэннем дзейнасці, што належыць да прэрагатыў органаў дзяржаўнай улады (паліцыі, узброеных сіл, міністэрства замежных спраў і да т.п.), любая асоба, якая з'яўляецца грамадзянінам краіны ЕС, мае права ўдзельнічаць у забеспячэнні паслуг у галінах аховы здароўя, адукацыі, іншых грамадскіх паслуг у любым месцы саюза. Хіба не натуральна наняць брытанскага настаўніка дзеля выкладання англійскай мовы ў Рыме або прапанаваць выпускніку французскага універсітэта трымаць іспыт на пасаду ў грамадзянскай службе Бельгіі?

Аднак еўрапейскі грамадзянін - гэта не толькі спажывец або выканаўца эканамічнай або сацыяльнай ролі. Ён ці яна з'яўляецца грамадзянінам Еўрапейскага саюза і ў такой якасці валодае пэўнымі палітычнымі правамі. Згодна з Маастрыхцкім дагаворам, кожны грамадзянін саюза, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці, мае права выбіраць і быць абраны на муніцыпальных выбарах або выбарах у Еўрапейскі парламент у сваёй краіне.

Грамадзянства саюза замацаванае ў артыкуле 17 Амстэрдамскага дагавора: *"Кожны чалавек, які з'яўляецца грамадзянінам дзяржавы - удзельніцы ЕС, з'яўляецца грамадзянінам саюза. Грамадзянства саюза дапаўняе, а не замяняе нацыянальнае грамадзянства"*.

## Фундаментальныя правы

Амстэрдамскі дагавор не абмяжоўваецца простай дэкларацыяй фундаментальных правоў. Ён уводзіць працэдуру прыпынення членства ў ЕС любой краіны, якая парушае асноўныя правы грамадзян ЕС. Дагавор пашырае прынцып забароны дыскрымінацыі так, што, акрамя нацыянальнай прыналежнасці, ён ахоплівае таксама полавую, расавую, рэлігійную прыналежнасць, узроставыя групы і сексуальную арыентацыю. Дагавор падмацоўвае прынцып роўнасці мужчын і жанчын.

Нарэшце, Амстэрдамскі дагавор ўдасканаліў палітыку празрыстасці ЕС, пашырыўшы доступ грамадзян да афіцыйнай дакументацыі еўрапейскіх устаноў.

Адданасць Еўрапейскага саюза абароне правоў грамадзян была пацверджаная ў Ніццы ў снежні 2000 года, калі была ўрачыста абвешчаная **Хартыя фундаментальных правоў Еўрапейскага саюза**. Гэтая хартыя была падрыхтаваная Канвентам, у які ўваходзілі члены нацыянальных парламентаў і Еўрапейскага парламента, прадстаўнікі нацыянальных урадаў і адзін член Камісіі. У 54 артыкулах хартыі, падзеленых на шэсць раздзелаў: "Годнасць", "Свабоды", "Роўнасць", "Салідарнасць", "Правы грамадзян" і "Правасуддзе", - выкладаюцца фундаментальныя каштоўнасці Еўрапейскага саюза, а таксама грамадзянскія, палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя правы грамадзяніна ЕС.

Уводныя артыкулы тычацца чалавечай годнасці, права на жыццё, недатыкальнасці асобы, свабоды слова і веравызнання. Раздзел "Салідарнасць" па-новаму аб'ядноўвае сацыяльныя і эканамічныя правы, напрыклад:

- права на страйкі;
- права працаўнікоў на інфармацыю і выказванне сваёй думкі;
- права на сумяшчэнне асабістага і прафесійнага жыцця;
- права на ахову здароўя, сацыяльнае забеспячэнне і сацыяльную падтрымку ў межах Еўрапейскага саюза.

Гэты раздзел таксама сцвярджае роўнасць мужчыны і жанчыны і ўводзіць такія правы, як права на абарону інфармацыі, забарона на еўгенічную практыку і кланаванне чалавека, права на ахову навакольнага асяроддзя, правы дзяцей і састарэлых, а таксама права на справядлівае кіраванне.

"Грамадзянская Еўропа" з'яўляецца правобразам нейкай формы палітычнай арганізацыі Еўропы, дэталёвы характар якой яшчэ належыць вызначыць. Якія каштоўнасці і памкненні народы Еўропы палічаць за лепшае падзяляць у межах Еўрапейскага саюза, што аб'ядноўвае 25 і болей дзяржаў?

## Еўропа - гэта культура і адукацыя

Пачуццё прыналежнасці да Еўропы і да адзінай еўрапейскай супольнасці не можа быць створанае штучна. Яно здольнае ўзнікнуць толькі праз асэнсаванне агульных культурных каранёў - вось чаму сучаснай Еўропе неабходна сфакусаваць увагу не толькі на эканоміцы, але і на культуры.

Першыя крокі прадугледжаныя праграмамі ЕС у галіне адукацыі і прафесійнага навучання, такімі як "Эразмус" (пашырае свабоду руху студэнтаў), "Комет" (тэхнічнае навучанне і падрыхтоўка) і "Лінгва", што заахвочвае вывучэнне замежных моў. Больш за мільён студэнтаў атрымалі магчымасць навучацца за мяжой дзякуючы праграме "Эразмус".

Еўрапейскі саюз паставіў мэту, якая палягае ў тым, што 10% яго студэнтаў мусяць прайсці гадавы курс вышэйшай адукацыі ў якой-небудзь іншай еўрапейскай краіне. Дзеля гэтага належыць павялічыць інвестыцыі ЕС у адукацыйную палітыку. Далейшыя поспехі ў гэтым кірунку стануць магчымыя дзякуючы праграмам **"Сакрат", "Леанарда да Вінчы"** і **"Моладзь"**.

Дырэктыва аб **тэлебачанні без межаў** дае гледачам болей шырокі доступ да тэлевізійных праграм еўрапейскай вытворчасці. Еўрапейскія шырокавяшчальныя карпарацыі павінны ўключаць пэўны працэнт еўрапейскіх праграм у свае сеткі вяшчання. Гэтая дырэктыва ўводзіць болей жорсткія захады дзеля абароны моладзевай аўдыторыі і падтрымкі праграм незалежных прадзюсераў, а таксама ўстанаўлівае правілы датычна рэкламы і пакупак праз тэлебачанне.

Рамкавая праграма **"Культура 2000"** на 2000-2004 гады скіраваная на тое, каб развіваць узаемадзеянне паміж вытворцамі праграм, рэкламадаўцамі, вяшчальнымі кампаніямі, сеткамі і культурнымі ўстановамі.

Праграма **"MEDIA+"** (2001-2005 гады) забяспечвае падтрымку аўдыёвізуальнай індустрыі. Зараз адчуваецца недахоп тэлевізійных праграм і фільмаў еўрапейскай вытворчасці ў параўнанні з вялікім аб'ёмам амерыканскай прадукцыі. Мэта праграмы "MEDIA+" у тым, каб выправіць гэтую дыспрапорцыю і заахвочваць пракат еўрапейскіх фільмаў і праграм у Еўропе.

## Пачуццё прыналежнасці

Ідэя "грамадзянскай Еўропы" даволі новая. Яе ажыццяўленне будзе азначаць, сярод іншага, забеспячэнне грамадскай падтрымкі сімвалам еўрапейскай прыналежнасці: пашпарту еўрапейскага ўзору (выкарыстоўваецца з 1985 года), гімну Еўропы (ода "Да радасці" на музыку Бетховена) і еўрапейскаму сцягу (кола з 12 залатых зорак на сінім фоне). З 1996 года ва ўсіх дзяржавах ЕС выдаюцца шафёрскія пасведчанні ўзору ЕС.

З 1979 года Еўрапейскі парламент абіраецца прамым усеагульным галасаваннем. Гэта забяспечвае болей шырокую дэмакратычную легітымнасць працэсу еўрапейскага аб'яднання, непасрэдна знітоўваючы яго з воляй людзей. Еўропа мае патрэбу ў далейшай дэмакратызацыі за кошт павышэння ролі парламента, стварэння рэальных еўрапейскіх палітычных партый і прадастаўлення простым грамадзянам большага ўплыву на працэс прымання палітычных рашэнняў ЕС праз няўрадавыя арганізацыі і іншыя добраахвотныя аб'яднанні.

Увядзенне банкнот і манет еўра з 1 студзеня 2002 года мела вялікі псіхалагічны эфект. Большасць еўрапейцаў зараз трымаюць банкаўскія рахункі ў еўра і могуць набываць тавары і паслугі па ўсім ЕС, паколькі цэны ў большасці яго краін вызначаюца ў еўра і могуць параўноўвацца нэпасрэдна. Дзякуючы Шэнгенскаму пагадненню на большай частцы межаў паміж краінамі ЕС скасаваны памежны кантроль, і гэта само па сабе дае грамадзянам пачуццё прыналежнасці да адзінага аб'яднанага геаграфічнага рэгіёна. Шэнгенская зона будзе расці па меры таго, як ўсё болей краін будуць да яе далучацца.

Каб наблізіць ЕС да яго грамадзян, Дагавор аб Еўрапейскім саюзе заснаваў пасаду амбудсмена. Ён абіраецца Еўрапейскім парламентам, і тэрмін яго паўнамоцтваў такі самы, як і ў парламента. Задача амбудсмена палягае ў расследаванні скаргаў на інстытуты і органы ЕС. Скаргі могуць падавацца любым грамадзянінам ЕС, а таксама любой асобай ці ўстановай, што жыве або знаходзіцца ў дзяржаве ЕС. Амбудсмен імкнецца дасягнуць пагаджальнага ўрэгулявання калізіі паміж істцом і адпаведным інстытутам або органам.

Іншым важным элементам сувязі паміж грамадзянамі і інстытутамі ЕС з'яўляецца сталая практыка, калі парламент прымае петыцыі ад любой асобы, што пастаянна жыве ў дзяржаве ЕС.

*"Мы лучым не дзяржавы, а людзей"*, - заявіў Жан Манэ яшчэ ў 1952 годзе. Стварэнне грамадскай падтрымкі еўрапейскай інтэграцыі дасюль застаецца галоўнай праблемай, што стаіць перад інстытутамі ЕС.

# 10 Свабода, бяспека і правасуддзе

Грамадзяне Еўропы маюць права на вольнае, пазбаўленае страху пераследу і гвалту, жыццё ў любой частцы Еўрапейскага саюза. Тым не менш міжнародная злачыннасць і тэрарызм ўваходзяць у лік фактараў, якія найбольш непакояць сёння еўрапейцаў.

Гэтыя праблемы вымагаюць тэрміновых сумесных дзеянняў на ўзроўні ЕС. Зусім відавочна, што Еўрапейскаму саюзу патрэбная палітыка ў галіне правасуддзя і ўнутраных спраў, асабліва зараз, калі пашырэнне прымушае па-новаму падысці да праблемы ўнутранай бяспекі Еўропы.

У працэсе стварэння Еўрапейскай эканамічнай супольнасці дзейнасць ЕС у гэтай галіне не абмяркоўвалася. Артыкул 3 Рымскага дагавора проста канстатуе, што Супольнасць мусіць прыняць *"захады ў галіне ўезду і руху людзей"*. Аднак з цягам часу стала зразумела: свабода перамяшчэння павінна азначаць, што кожны паўсюдна у ЕС карыстаецца аднолькавай абаронай і роўным доступам да правасуддзя. Такім чынам, першапачатковыя дагаворы былі зменены, па-першае, Адзіным еўрапейскім актам, а затым Маастрыхцкім і Амстэрдамскім дагаворамі.



## Свабода перамяшчэння

Асабістая свабода перамяшчэння па ЕС ставіць перад дзяржавамі-удзельніцамі праблемы бяспекі, бо на большасці ўнутраных межаў саюза кантроль скасаваны. Таму варта зрабіць дадатковыя захады ў мэтах бяспекі на *вонкавых* межах ЕС. А паколькі свабодай руху ў саюзе карыстаюцца і злачынцы, нацыянальныя паліцэйскія сілы і органы юстыцыі ЕС мусяць працаваць супольна дзеля выкаранення міжнароднай злачыннасці.

Усе тры канцэпцыі - свабоды, бяспекі і правасуддзя, па сутнасці, моцна злітаваныя. Свабода шмат у чым страчвае сэнс, калі людзі не могуць разлічваць на бяспеку, што ахоўваецца прававой сістэмай, на якую ўсе абапіраюцца ў роўнай ступені.

15-16 кастрычніка 1999 года Еўрапейскі саюз наладзіў адмысловую нараду ў Тамперэ (Фінляндыя), дзе абмяркоўвалася ўсё кола пытанняў, звязаных з юстыцыяй і ўнутранымі справамі. Лідэры краін ЕС дасягнулі пагаднення датычна вельмі дакладнай і амбіцыйнай праграмы дзеянняў, паводле якой належыць правесці да 2004 года мерапрыемствы прыкладна па 60 пунктах, каб ператварыць саюз ў "*зону свабоды, бяспекі і правасуддзя*". Перад Еўрапейскай камісіяй была пастаўленая задача кантраляваць выкананне праграмы ЕС з выкарыстаннем балавай сістэмы.

У Тамперэ разглядаліся наступныя асноўныя пытанні:

- агульная палітыка ЕС у пытаннях прадастаўлення прытулку і міграцыі;
- рэальная еўрапейская зона правасуддзя;
- барацьба са злачыннасцю ў межах саюза;
- болей актыўныя дзеянні вонкавага характару.

Адзін з найважнейшых крокаў у пытанні спрашчэння фармальнасцей, звязаных з пераездамі ў Еўрапейскім саюзе, быў зроблены ў 1985 годзе, калі ўрады Бельгіі, Францыі, Германіі, Люксембурга і Нідэрландаў падпісалі пагадненне ў невялікім гарадку Шэнген на мяжы Люксембурга. Яны дамовіліся скасаваць на агульных межах любы асабісты дагляд, незалежна ад грамадзянства, прывесці меры памежнага кантролю ў адпаведнасць з тымі, што скарыстоўваюцца ў краінах, якія не з'яўляюцца членамі ЕС, і прыняць агульную візавую палітыку.

Такім чынам яны сфарміравалі зону без унутраных межаў, вядомую як Шэнгенская зона. Толькі на яе вонкавых межах грамадзяне ЕС мусяць прад'яўляць пасведчанне асобы або пашпарт.

Шэнгенскае пагадненне 1985 года, канвенцыя 1990 года па яго ажыццяўленні і ўсе законы, вытворныя ад гэтых пагадненняў, зараз сталі неад'емнай часткай дагавораў аб ЕС, і Шэнгенская зона паступова пашырылася. З сакавіка 2001 года шэнгенскія правілы цалкам выконваюцца Ісландыяй, Нарвегіяй, а таксама 13 краінамі ЕС (Аўстрыяй, Бельгіяй, Даніяй, Фінляндыяй, Францыяй, Германіяй, Грэцыяй, Італіяй, Люксембургам, Нідэрландамі, Партугаліяй, Іспаніяй і Швецыяй).

Задача не ў тым, каб стварыць Еўропу-крэпасць, а у тым, каб спрасціць легальны ўезд у Еўрапейскі саюз і вольны рух па ім. Адначасова ЕС поўны рашучасці змагацца з дзейнасцю крымінальных структур, што займаюцца эксплуатацыяй людзей.

## Палітыка ў галіне прадастаўлення прытулку і іміграцыі

Еўропа ганарыцца шматвекавой традыцыяй гасціннасці у адносінах да іншаземцаў і чалавечнай завядзёнкай даваць прытулак уцекачам, што ратуюцца ад небяспекі і пераследу. Зараз урады ЕС стаяць перад надзённым пытаннем, што рабіць з усё большай колькасцю імігрантаў, як легальных, так і нелегальных, на абсягу, што не мае ўнутраных межаў.

Урады ЕС дамовіліся ўзгадніць свае заканадаўствы, каб заявы аб прадастаўленні прытулку разглядаліся ў адпаведнасці з сістэмай асноўных прынцыпаў, што аднолькава прызнаюцца ва ўсім Еўрапейскім саюзе. У Тамперэ была вызначаная мэта прыняць агульную працэдуру прадастаўлення палітычнага прытулку і ўсталяваць адзіны рэжым у дачыненні да асобаў, якім гэты прытулак дадзены. ЕС надзеліць імігрантаў правамі і абавязкамі, што аналагічныя правам і абавязкам еўрапейскіх грамадзян. Аб'ём гэтых правоў і абавязкаў будзе змяняцца ў залежнасці ад таго, наколькі доўга тая ці іншая асоба стала жыве на законнай падставе ў Еўрапейскім саюзе.

## Барацьба з міжнароднай злачыннасцю

Дзеля таго каб палітыка барацьбы з міжнароднай злачыннасцю была жыццяздольнай, ЕС мусіць мець эфектыўную сістэму кіравання іміграцыяй, уключна з адпаведным кантролем на вонкавых межах і дзейснымі сродкамі папярэджвання нелегальнай іміграцыі. Неабходная каардынацыя намаганняў, скіраваных на барацьбу з крымінальнымі групоўкамі, што накіроўваюць працу сетак нелегальнай іміграцыі і эксплуатуюць неабароненыя слаі насельніцтва, у прыватнасці жанчын і дзяцей.

Арганізаваная злачыннасць становіцца ўсё болей хітрай і рэгулярна выкарыстоўвае дзеля сваіх мэтаў еўрапейскія і міжнародныя камунікацыі. Тэрарызм выразна паказаў, што можа наносіць жорсткія ўдары ў любым пункце зямнога шара. Менавіта таму была створаная **Шэнгенская інфармацыйная сістэма.** Яна ўяўляе сабой складаную базу звестак, што дазваляе праваахоўным органам і органам правасуддзя абменьвацца інфармацыяй пра асоб і маёмасць, якія знаходзяцца ў вышуку, напрыклад пра скрадзеныя аўтамабілі, творы мастацтва або асоб, у дачыненні да якіх выдадзены ордэр на арышт або накіраванае патрабаванне аб экстрадыцыі.
Адным з найболей дзейсных спосабаў злову злачынцаў з'яўляецца адсочванне іх незаконна набытай маёмасці. Дзеля гэтага, а таксама каб спыніць фінансаванне крымінальных групоўак, ЕС прыняў заканадаўства датычна папярэджвання адмывання грошай.
Несумненна, самым буйным дасягненнем апошніх гадоў у галіне супрацоўніцтва паміж праваахоўнымі органамі было стварэнне **Еўрапола.** Гэты орган ЕС аб'ядноўвае службовых асоб паліцыі і мытні, і ў яго абавязкі ўваходзіць выкананне законаў ва ўсім Еўрапейскім саюзе. Ён мае справу з самым шырокім колам міжнародных злачынстваў: кантрабандай наркотыкаў, гандлем скрадзенымі аўтамабілямі, нелегальнай іміграцыяй, сексуальнай эксплуатацыяй жанчын і дзяцей, парнаграфіяй, фальшаваннямі, незаконным вывазам радыёактыўных і ядзерных матэрыялаў, тэрарызмам, адмываннем грошай і падробкай еўра.

## Насустрач еўрапейскаму прававому абсягу

Зараз у Еўрапейскім саюзе адначасова працуюць у межах дзяржаў-удзельніц болей за 15 сістэм судаўладкавання. Людзі, жывучы ў краіне, грамадзянамі якой не з'яўляюцца, могуць сутыкнуцца з сямейнымі ці працоўнымі праблемамі, якія мусяць вырашацца ў адпаведнасці з незнаёмай сістэмай права, што яшчэ болей абцяжарвае штодзённае жыццё. Калі саюз зацікаўлены ў вольным руху людзей у сваіх межах і ў забеспячэнні для іх правасуддзя паўсюдна, яго прававыя сістэмы мусяць палягчаць, а не абцяжарваць жыццё асобы.

ЕС заснаваў праграмы, скіраваныя на згуртаванне юрыстаў-практыкаў з розных краін саюза. Праграма **"Гротыус"**, напрыклад, дапамагла юрыстам і суддзям даведацца, як працуюць прававыя сістэмы іншых краін ЕС. Праграма **"Фальконэ"** спрыяла ўсталяванню кантактаў паміж судамі, пракуратурамі, паліцэйскімі і мытнымі службамі Еўрапейскага саюза.

Аднак найбольш яскравым прыкладам практычнага супрацоўніцтва ў гэтай галіне з'яўляецца праца цэнтральнай каардынацыйнай структуры - **Еўраюста**. Яго задача палягае ў тым, каб спрыяць узаемадзеянню нацыянальных следчых і пракурорскіх органаў у расследаванні злачынстваў, якія закранаюць некалькі краін ЕС.

Узаемадзеянне паміж судамі ў розных краінах можа ўскладняцца розніцай у вызначэнні асобных злачынных дзеянняў. Аднак міжнародная злачыннасць, у тым ліку тэрарызм, не ведае нацыянальных межаў. Каб дзейсна змагацца з ім, саюз паступова ўкараняе агульную палітыку пакарання. Мэта - стварыць адзіную нарматыўна-прававую базу ў пытанні барацьбы з тэрарызмам, гарантаваць высокі ўзровень абароны сваіх грамадзян і актывізаваць міжнароднае супрацоўніцтва ў гэтай галіне.

Да 1997 года такія пытанні, як палітычны прытулак і іміграцыя, кантроль перасячэння вонкавых межаў (візы) і супрацоўніцтва судоў у грамадзянскіх і камерцыйных справах, уваходзілі ў сферу прамога ўзаемадзеяння ўрадаў краін ЕС. Аднак Амстэрдамскі дагавор перавёў гэтыя пытанні з галіны міжурадавага супрацоўніцтва ў кампетэнцыю Супольнасці, каб яны маглі вырашацца болей дзейсна праз скарыстанне выпрабаванай методыкі Супольнасці.

Аднак гэты крок быў абстаўлены шэрагам умоў: пяцігадовы пераходны перыяд, права ініцыятывы, якім сумесна карыстаюцца Камісія і дзяржавы-удзельніцы, аднагалоснае прыманне рашэнняў, выключна кансультацыйная роля Еўрапейскага парламента, абмежаванне паўнамоцтваў Суда Еўрапейскіх супольнасцей.

Адна сфера ўсё ж застаецца выключна міжурадавай - супрацоўніцтва органаў паліцыі і правасуддзя ў крымінальных пытаннях. Згодна з Маастрыхцкім дагаворам, дзейнасць урадаў краін ЕС у гэтай галіне, адчувальнай у сэнсе нацыянальнага суверэнітэту, каардынуе Савет. Камісія дзеліць тут права ініцыятывы з дзяржавамі.

У Тамперэ палітычныя лідэры ЕС паставілі мэту стварыць зону свабоды, бяспекі і правасуддзя да канца 2004 года.

# 11 Еўрапейскі саюз на сусветнай арэне

У эканамічных, гандлёвых і фінансавых адносінах Еўрапейскі саюз ператварыўся ў буйную сусветную сілу. Ён валодае значным уплывам у міжнародных арганізацыях, такіх як Сусветная гандлёвая арганізацыя (СГА), спецыялізаваныя ўстановы ААН, а таксама на сусветных самітах у пытаннях навакольнага асяроддзя і развіцця.

Хто-ніхто кажа, што ЕС - эканамічны волат, але палітычны карлік. Вядома, гэта перавелічэнне. Аднак праўда тое, што ў дыпламатычным і палітычным плане дзяржавам ЕС належыць прайсці доўгі шлях, перш чым яны здолеюць выказваць адзіную думку ў такіх сур'ёзных пытаннях, як мір і стабільнасць, тэрарызм, Блізкі Усход, стасункі з ЗША і роля Савета бяспекі ААН. Краіны ЕС захоўваюць поўны нацыянальны суверэнітэт над сваімі ўзброенымі сіламі. Іх сістэмы абароны цалкам знаходзяцца ў руках нацыянальных урадаў і знітаваныя толькі тымі сувязямі, што створаныя ў межах такіх блокаў, як НАТО.

## Зараджэнне агульнай палітыкі ў галіне абароны

Агульная вонкавая палітыка і палітыка ў галіне бяспекі, а таксама палітыка ў галіне еўрапейскай бяспекі і абароны (ПЕБА), прадугледжаныя Маастрыхцкім і Амстэрдамскім дагаворамі, вызначаюць галоўныя задачы ЕС у галіне абароны.



На гэтай падставе ЕС распрацаваў сваё "другое апірышча" - галіну палітыкі, у якой рашэнні прымаюцца шляхам згоды паміж урадамі і дзе Камісіі і парламенту адводзіцца другарадная роля. Рашэнні ў гэтай сферы прымаюцца згодна з прынцыпам кансэнсусу, які дазваляе асобным краінам устрымацца.

У 2003 годзе палітычнае і стратэгічнае становішча ЕС мае наступны выгляд.

- Паколькі Расія ідзе шляхам партнёрства з Захадам, а былыя камуністычныя краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы практычна адначасова ўступаюць у НАТО і ЕС, больш чым паўвекавая гісторыя "халоднай вайны" сапраўды засталася далёка ззаду. Еўрапейскі кантынент набывае рысы міру і згоды, еўрапейскія краіны супрацоўнічаюць у галіне барацьбы з міжнароднай злачыннасцю, такой як нелегальная іміграцыя і адмыванне грошай. ЕС наладзіў арганізаваныя партнёрскія стасункі са сваімі буйнымі суседзямі, такімі як Расія і Украіна, не маючы на мэце іх далучэнне да Еўрапейскага саюза, ва ўсякім разе ў сярэднетэрміновай перспектыве.

- Дзяржавы ЕС імкнуцца пабудаваць еўрапейскую палітыку ў галіне бяспекі і абароны згодна з дагаворамі. У снежні 1999 года пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Хельсінкі паставіла перад ЕС канкрэтную задачу: да 2003 года забяспечыць магчымасць разгортваць за 60 дзён баявыя сілы колькасцю да 60 000 вайскоўцаў, пры падтрымцы з мора і паветра, і падтрымліваць іх у боегатоўнасці па меншай меры на працягу года. Гэтыя сілы хуткага рэагавання не з'яўляюцца еўрапейскай арміяй, яны будуць складацца з кантынгентаў нацыянальных узброеных сіл. Аднак іх дзеянні будуць каардынавацца Камітэтам палітыкі і бяспекі, Вайсковым камітэтам і вайсковым штабам пад эгідай Савета. Яны будуць раскватараваныя ў Бруселі. Гэта забяспечыць саюзу палітычны і вайсковы сродак выканання пэўных задач - гуманітарных і ратавальных місій па-за межамі Еўропы, міратворчых аперацый і іншых задач у надзвычайных сітуацыях.

- ЗША згодныя, каб у баявых дзеяннях, у якіх Амерыка не жадае ўдзельнічаць, Еўропа магла скарыстоўваць частку матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння НАТО, напрыклад яго разведку, службы сувязі, кіравання і транспарту.

- Рэальныя сродкі абароны і застрашвання, такія як ядзерная зброя, што маецца на ўзбраенні Францыі і Вялікабрытаніі, застаюцца пад нацыянальным кантролем. Па меры таго як вайсковая тэхніка робіцца ўсё болей дарагой і дасканалай, урады краін ЕС будуць бачыць усё большую неабходнасць супрацоўнічаць у вытворчасці ўзбраенняў. Калі іх узброеныя сілы будуць выконваць сумесныя аперацыі, то іх сістэмы мусяць быць сумяшчальнымі, а абсталяванне дастаткова стандартызаваным.

- Атакі на Вашынгтон і Нью-Йорк 11 верасня 2001 года і разгул тэрарызму, што ахапіў пасля многія рэгіёны свету, карэнным чынам змянілі стратэгічнае становішча. Еўрапейскія краіны наладзілі шчыльнае супрацоўніцтва ў пытаннях абмену інфармацыяй, якая можа дапамагчы ў прадухіленні такіх атак. Паколькі барацьба з тэрарызмам з'яўляецца глабальным прыярытэтам, сёння Еўропа выходзіць за межы сваіх традыцыйных альянсаў, супрацоўнічаючы не толькі з ЗША, але і з многімі іншымі краінамі свету ў падтрымцы дэмакратыі і правоў чалавека.

З улікам гэтага зменлівага стратэгічнага становішча Еўрапейскі саюз стараецца захоўваць аптымальны баланс паміж рознымі традыцыямі сваіх нацый у галіне палітыкі бяспекі і абароны.

## "Калі я пажадаю пагутарыць з Еўропай, каму тэлефанаваць?"

Канвенцыя аб будучыні Еўропы прапануе змены, што маглі б даць Еўропе нашмат выразнейшую тоеснасць. Шэраг краін падтрымліваюць ідэю наконт прэзідэнта ЕС, які быў бы ўпаўнаважаны выступаць ад імя саюза на міжнароднай арэне. Такім прэзідэнтам мог бы з'яўляцца член або былы член Еўрапейскага савета, і тэрмін яго паўнамоцтваў быў бы даўжэйшы, чым цяперашні тэрмін паўнамоцтваў старшыні Савета. Гэта было б адказам на знакамітае пытанне **Генры Кісінджэра**, зададзенае ў 1970-х гадах: *"Калі я пажадаю пагутарыць з Еўропай, каму тэлефанаваць?"*.

Аднак цэлы шэраг пытанняў застаецца адкрыты. Як будзе прызначацца гэты прэзідэнт ЕС? Якая будзе яго рэальная ўлада? Што стане з цяперашнім вярхоўным прадстаўніком у пытаннях агульнай вонкавай палітыкі і палітыкі ў галіне бяспекі? Ці будзе прэзідэнт ЕС мець уладу над вайсковым штабам і сіламі хуткага рэагавання ЕС? Якія сродкі дэмакратычнага кантролю будуць распаўсюджвацца на прэзідэнта? Ці павінны будзе прэзідэнт атрымліваць згоду кожнага члена Еўрапейскага савета, перш чым прымаць любое важнае рашэнне? Як будзе пасада прэзідэнта ЕС суадносіцца з пасадамі старшыні Еўрапейскай камісіі і члена Еўрапейскай камісіі, адказнага за вонкавыя сувязі?

Амстэрдамскі дагавор таксама ставіў задачу ўсталяваць працэдуру, якая забяспечвала б дастатковую гнуткасць у сферы вонкавай палітыкі і палітыкі ў галіне бяспекі. Прынцып "павышанага ўзаемадзеяння" дазволіў бы групе краін ажыццяўляць дзейнасць, у якой іншыя дзяржавы саюза не жадаюць браць удзел, напрыклад зважаючы на традыцыі нейтралітэту.

Складанасць гэтага нібыта прагматычнага рашэння палягае ў тым, што інтэграцыя саюза ўвогуле і давер да яго на міжнароднай арэне пахіснуліся б, калі б еўрапейская вонкавая палітыка ператварылася ў рэч са "зменлівай геаметрыяй". Яшчэ больш, узрасла б рызыка разрыву сувязей паміж унутранай палітыкай ЕС (кіраванне адзіным рынкам, палітыка канкурэнцыі, эканамічны і фінансавы саюз, унутраная бяспека і да т.п.) і яго вонкавай палітыкай (гандаль, падтрымка развіцця, дыпламатыя і абарона).

У будучыні надзвычай важна, каб еўрапейцы дзейнічалі разам і мелі палітыку, зразумелую ўсім. Неабходна, каб еўрапейскія краіны выступалі аднадушна, дэманстравалі рашучасць у адстойванні сваіх асноўных інтарэсаў і непахісную салідарнасць у абароне лёсу сваіх народаў.

## Адкрытая свету Еўропа

Завяршэнне афармлення адзінага рынку ў 1993 годзе паўплывала на гандлёвую палітыку ЕС. Абмежаванні на імпарт, якія раней краіны ЕС мелі права накладаць, зараз марудна, але няўхільна скасоўваліся, гэтаксама як і ўнутранае размеркаванне "жыццёва важных" прадметаў імпарту, такіх як тэкстыль, сталь, аўтамабілі і вырабы электроннай прамысловасці. СГА, створаная на ініцыятыву Еўропы, з'явілася сталым форумам вырашэння гандлёвых спрэчак праз шматбаковыя перагаворы.

Сярэднеўзважаны аб'ём мытных пошлін на прамысловыя тавары, што ўвозяцца ў Еўрапейскі саюз, складае меней за 5%. ЕС і яго сусветныя гандлёвыя партнёры дамовіліся пра новыя правілы гандлю паслугамі і прадукцыяй сельскай гаспадаркі. Дыскусіі пра сельскую гаспадарку выявілі разыходжанні ў поглядах вытворцаў па абодва бакі Атлантычнага акіяна. Паколькі ЕС выступіў на гэтых перамовах адзіным фронтам, яму ўдалося наладзіць дзейсную абарону пункту погляду дзяржаў-удзельніц.

ЕС уяўляе сабой адзіны гандлёвы блок і з'яўляецца домам для 373 мільёнаў спажыўцоў (амаль што паўмільярда пасля пашырэння), якія маюць вельмі параўнальны высокі сярэдні ўзровень даходаў. Сам па сабе гэта вельмі прывабны рынак для экспарцёраў у іншых краінах. ЕС можа скарыстоўваць свой уплыў, каб пераканаць гандлёвых партнёраў выконваць правілы гульні, што забяспечваюць сумленную канкурэнцыю і роўны ўзаемны доступ на рынкі.

## Важны партнёр у індустрыяльным свеце

З пункту гледжання ЗША, новая Еўропа, што зараз будуецца, уяўляе сабой не толькі саюзніка, які падзяляе тыя самыя каштоўнасці, але і канкурэнта ў гандлі і тэхналогіі. Блок НАТО, які аб'ядноўвае ЗША і многія краіны ЕС, спрыяў змякчэнню наступстваў трансатлантычных рознагалоссяў у пытаннях сельскагаспадарчай прадукцыі, сталі і аэракасмічнай прамысловасці.

Радыкальныя змены, што адбыліся пры канцы ХХ стагоддзя, у прыватнасці сканчэнне "халоднай вайны", пераўтварылі свет міжнароднай палітыкі. У гэтых новых умовах краіны НАТО мусяць пераглядаць свае стасункі. Еўраамерыканскае супрацоўніцтва мае патрэбу ў новых мэтах. Саюзнікі мусяць разам працаваць дзеля папярэджвання новых пагроз: распаўсюду ядзернай зброі, міжнароднага тэрарызму, міжнароднай злачыннасці, напрыклад гандлю наркотыкамі, і да т.п. У галіне гандлю і інвестыцый Еўрапейскі саюз з'яўляецца галоўным і адзіным партнёрам ЗША, з якім у іх стабільныя стасункі. Тым не менш Еўропе даводзіцца сутыкацца з пэўнай схільнасцю Кангрэса ЗША рабіць аднабаковыя дзеянні, здольныя пагражаць глабальным інтарэсам Еўропы.

## Стасункі паміж ЕС і краінамі Міжземнамор'я

На невялікай адлегласці ад Еўропы, на паўднёвым беразе Міжземнага мора, знаходзяцца краіны, з якімі ЕС мае гістарычныя і культурныя сувязі. Між гэтымі двума рэгіёнамі адбываецца ажыўленая міграцыя, якая ў будучыні можа стаць яшчэ болей інтэнсіўнай. Таму гэтыя краіны з'яўляюцца вельмі важнымі партнёрамі для ЕС, які традыцыйна прытрымліваўся палітыкі міжземнаморскай рэгіянальнай інтэграцыі.

Міжземнаморскія суседзі ЕС аднымі з першых усталявалі асаблівыя эканамічныя і гандлёвыя стасункі з саюзам. У лістападзе 1995 года ў Барселоне адбылася важная канферэнцыя, у якой бралі ўдзел усе дзяржавы ЕС і краіны Міжземнамор'я (за выключэннем Лівіі, Албаніі і былых рэспублік Югаславіі). Гэтая канферэнцыя заклала падмурак новага еўра-міжземнаморскага партнёрства, што мае на ўвазе:

- палітычны дыялог паміж краінамі-удзельніцамі і партнёрства ў галіне бяспекі, заснаванае, у прыватнасці, на механізмах кантролю над узбраеннямі і мірнага вырашэння канфліктаў;

- развіццё эканамічных і гандлёвых сувязей паміж двума рэгіёнамі. Ключавой задачай пры гэтым з'яўляецца стварэнне да 2010 года еўра-міжземнаморскай зоны свабоднага гандлю згодна з правіламі СГА. Калі гэта адбудзецца, з'явіцца магчымасць без пошлін гандляваць таварамі на трансміжземнаморскім рынку, які стане найбуйнейшай у свеце зонай свабоднага гандлю, што ахопіць да 800 мільёнаў спажыўцоў;

- партнёрства ў сацыяльнай, культурнай і іншых галінах.

ЕС згодна з праграмай МЕДА вылучыць краінам Міжземнамор'я фінансавую дапамогу ў памеры 5,3 мільярда еўра на працягу 2000-2006 гадоў.

## Афрыка

Сувязі паміж Еўропай і афрыканскімі краінамі рэгіёна Сахары маюць даўнюю гісторыю. З падпісаннем Рымскага дагавора ў 1957 годзе былыя калоніі і заморскія тэрыторыі шэрагу краін ЕЭС сталі асацыяванымі членамі Супольнасці. Дэкаланізацыя пачатку 1960-х гадоў ператварыла гэтыя сувязі ў лучнасць новага тыпу - аб'яднанне суверэнных краін.

Пагадненне ў Катану, падпісанае ў чэрвені 2000 года ў сталіцы Беніна, адзначыла пачатак новага этапа ў палітыцы развіцця ЕС. Пагадненне паміж Еўрапейскім саюзам і краінамі Афрыканскага, Карыбскага і Ціхаакіянскага рэгіёнаў з'яўляецца найболей амбіцыйным і далёка ідучым пагадненнем аб гандлі і дапамозе, што калі-небудзь заключалася паміж развітымі і развіванымі краінамі. Яно стала лагічным працягам Ламэйскай канвенцыі, што напачатку была падпісана ў 1975 годзе ў сталіцы Тога і потым дапрацоўвалася праз рэгулярныя прамежкі часу.

Асноўная мэта пагаднення тая самая, што і Ламэйскай канвенцыі, - *"спрыянне паскарэнню эканамічнага, культурнага і сацыяльнага развіцця дзяржаў Афрыканскага, Карыбскага і Ціхаакіянскага рэгіёнаў, а таксама кансалідацыя і дыверсіфікацыя іх стасункаў (з Еўрапейскім саюзам і яго дзяржавамі-удзельніцамі) у духу салідарнасці і ўзаемнай выгады"*.

Прадметам Ламэйскай канвенцыі былі гандлёвыя стасункі і доступ на рынак. Пагадненне ў Катану закранае болей шырокае кола пытанняў. Напрыклад, уводзіць новыя працэдуры разгляду праблем парушэння правоў чалавека.

Еўрапейскі саюз даў асаблівыя гандлёвыя льготы найменей развітым краінам, 39 з якіх падпісалі пагадненне. З 2005 года яны атрымаюць магчымасць без пошлін экспартаваць практычна любыя віды прадукцыі ў ЕС.

Еўрапейскі фонд развіцця фінансуе праграмы для краін Афрыканскага, Карыбскага і Ціхаакіянскага рэгіёнаў з бюджэту ў суме 13,5 мільярда еўра на сямігадовы перыяд. Гэта з'яўляецца дадаткам да тых 9,5 мільярда еўра, што ўяўляюць сабой рэшту раней выдзеленых сродкаў, і 1,7 мільярда, прадастаўленых у выглядзе пазыкі Еўрапейскім інвестыцыйным банкам.

# 12 Якая будучыня Еўропы?

*"Надыдзе дзень, калі ўсе нацыі кантынента, захаваўшы свае адметныя рысы і выдатную непаўторнасць, зліюцца ў саюз болей высокага кшталту і створаць еўрапейскае братэрства. Надыдзе дзень, калі не застанецца іншых палёў змагання, акрамя палёў змагання думкі - адкрытых рынкаў абмену ідэямі. Надыдзе дзень, калі кулі і бомбы будуць замененыя галасаваннем".*

**Віктор Гюго** прамовіў гэтыя прарочыя словы ў 1849 годзе. Спатрэбілася болей за стагоддзе, каб ідэя, што здавалася утапічнай, пачала ажыццяўляцца. За гэты час дзве сусветныя вайны і безліч іншых канфліктаў на еўрапейскай зямлі забралі мільёны жыццяў. Быў час, калі здавалася, што надзеі болей няма. Сёння Еўропа ўваходзіць у XXI стагоддзе са святлейшымі перспектывамі і адроджанай надзеяй. Аднак новае стагоддзе нясе таксама новыя цяжкасці і праблемы.



Пашырэнне саюза да 25 дзяржаў прасоўвалася згодна з графікам, вызначаным інстытутамі ЕС. Са слоў палітычнага дзеяча адной з новых дзяржаў-удзельніц, "Еўропе нарэшце пашанцавала прымірыць сваю гісторыю з геаграфіяй". На працягу 2007-2015 гадоў мусіць адбыцца далейшае пашырэнне Еўрапейскага саюза. А пакуль што яго лідэрам трэба будзе, беручы пад пільную ўвагу грамадскую думку, вырашыць, дзе ў выніку мусяць праходзіць геаграфічныя, палітычныя і культурныя межы саюза.

**Пагадненне аб заснаванні** ЕС уяўляе сабой пакт паміж суверэннымі дзяржавамі, што вырашылі абраць агульны лёс і ўкладаць у агульную справу ўсё большую долю свайго суверэнітэту. Гэта тычыцца найболей актуальных для народаў Еўропы пытанняў: міру, бяспекі, прадстаўнічай дэмакратыі, правасуддзя і салідарнасці. Гэты пакт знаходзіць падтрымку і пацвярджэнне ва ўсёй Еўропе: паўмільярда чалавек палічылі за лепшае жыць пад уладай закону згодна з адвечнымі каштоўнасцямі, у цэнтры якіх знаходзяцца гуманізм і чалавечая годнасць.

Цяперашняя **тэхналагічная рэвалюцыя** радыкальна пераўтварае жыццё індустрыяльнага свету, у тым ліку Еўропы. Пры гэтым яна выклікае новыя праблемы, што выходзяць за нацыянальныя межы. Паасобку дзяржавы не ў стане эфектыўна вырашаць такія праблемы, як устойлівае развіццё, дэмаграфічная дынаміка і неабходнасць сацыяльнай салідарнасці. Сама па сабе палітыка асобных дзяржаў не можа забяспечыць эканамічны рост, а іх урады не ў стане даць этычны адказ на сусветны прагрэс у навуках аб жыцці. Забруджванне акіянаў нафтапрадуктамі ў выніку аварый нафтаналіўных суднаў або рызыка ядзерных катастроф кшталту чарнобыльскай вымагаюць калектыўных папераджальных захадаў, што ахоўвалі б агульнаеўрапейскія каштоўнасці і ашчаджалі іх дзеля наступных пакаленняў.

Пашыраны Еўрапейскі саюз з'яўляецца часткай **свету, які хутка ды радыкальна мяняецца** і мае патрэбу ў новай стабільнасці. Еўропа адчувае на сабе ўзрушэнні, што адбываюцца на іншых кантынентах, хай сабе гэта адраджэнне рэлігійнага радыкалізму ў ісламскім свеце, эпідэміі і голад у Афрыцы, цяга да аднабаковага прымання рашэнняў у Паўночнай Амерыцы, эканамічныя крызісы ў Лацінскай Амерыцы, дэмаграфічны выбух у Азіі ці глабальны рух вытворчасцей і працоўных месцаў.

Еўропе трэба не проста засяроджвацца на ўласным развіцці, але і быць цалкам уключанай у працэс глабалізацыі. Маючы ўсе падставы ганарыцца сваімі дасягненнямі ў гандлёвай палітыцы, Еўрапейскі саюз усё яшчэ мусіць прайсці доўгі шлях, перш чым здолее прэтэндаваць на выказванне адзінай думкі або на давер да сябе ў якасці суб'екта сусветнай палітыкі.

**Інстытуты ЕС** даказалі сваю жыццяздольнасць, аднак яны мусяць быць прыведзеныя ў адпаведнасць з усё большым аб'ёмам задач, што стаяць перад саюзам, які пашыраецца. Чым болей краін уваходзяць у ЕС, тым мацнейшыя цэнтрабежныя сілы, што пагражаюць яго разарваць. Кароткатэрміновыя меркаванні нацыянальных інтарэсаў могуць вельмі лёгка парушыць доўгатэрміновыя прыярытэты ўсяго саюза. Вось чаму ўсе ўдзельнікі гэтай беспрэцэдэнтнай справы мусяць несці сваю адказнасць і дзейнічаць такім чынам, каб інстытуцыйная сістэма ЕС працягвала працаваць эфектыўна. Любая значная змена існуючай сістэмы павінна забяспечваць павагу да еўрапейскага плюралізму. У рэшце рэштаў, найболей каштоўным здабыткам Еўропы з'яўляецца яе разнастайнасць - шматлікія адметныя рысы яе нацый. Рэформы павінны таксама ахапіць працэс прымання рашэнняў. Патрабаванне аднадушнасці проста паралізавала б гэты працэс. Адзіная працуючая сістэма - гэта палітычна-прававая сістэма, заснаваная на мажарытарным галасаванні і прынцыпе ўзаемазалежнасці і ўзаемаабмежавання заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады.

Праект **Канстытуцыі**, падрыхтаваны Канвентам, скіраваны на спрашчэнне дагавораў і павышэнне празрыстасці сістэмы прымання рашэнняў у ЕС. Грамадзяне ЕС жадаюць ведаць, хто і за што адказвае ў Еўропе, і адчуваць, што яна адпавядае іх штодзённым спадзяванням. Толькі ў гэтым выпадку людзі падтрымаюць ідэю еўрапейскай інтэграцыі і будуць зацікаўленыя браць удзел у еўрапейскіх выбарах. Праект Канстытуцыі ўносіць пэўнасць у пытанне пра тое, якія паўнамоцтвы і абавязкі належаць ЕС, якія - яго дзяржавам, а якія - мясцовым уладам. Ён недвухсэнсоўна абвяшчае, што еўрапейская інтэграцыя грунтуецца на легітымнасці двух відаў - непасрэдна выказанай волі людзей і легітымнасці нацыянальных урадаў. Нацыянальная дзяржава па-ранейшаму застаецца легітымным падмуркам функцыянавання еўрапейскіх грамадстваў.

Канстытуцыя з'яўляецца яшчэ адным важным крокам да кансалідацыі нацый і народаў Еўропы. Ці з'явіцца гэта фінальным этапам вялікага праекта, прадугледжанага бацькамі-заснавальнікамі ЕС? Ці палітычныя структуры Еўропы будуць эвалюцыянаваць і далей, ідучы насустрач свайму лёсу? Хто ведае!

# Асноўныя вехі ў гісторыі еўрапейскай інтэграцыі





**1948**

*7-11 мая*

Гаагскі кангрэс: больш за тысячу дэлегатаў ад амаль што 20 еўрапейскіх краін абмяркоўваюць новыя формы супрацоўніцтва ў Еўропе. Яны выказваюцца на карысць стварэння Еўрапейскай асамблеі.

**1949**

*27-28 студзеня*

Вынікам Гаагскага кангрэса стала стварэнне Савета Еўропы, які будзе стала знаходзіцца ў Страсбургу.

У тым самым годзе ён распачынае складаць праект Еўрапейскай канвенцыі правоў чалавека, якая падпісваецца ў Рыме ў 1950 годзе і набывае моц у верасні 1953 года.

З цягам часу амаль што ўсе еўрапейскія краіны становяцца членамі Савета Еўропы.

**1950**

*9 мая*

Міністр замежных спраў Францыі Рабер Шуман выступае з важнай прамовай, у якой вылучае прапановы, заснаваныя на ідэях Жана Манэ. Ён прапануе Францыі і Федэратыўнай Рэспубліцы Германіі аб'яднаць свае рэсурсы вугалю і сталі ў межах новай арганізацыі, да якой могуць далучыцца іншыя еўрапейскія краіны.

Паколькі гэтая дата можа лічыцца днём нарад-

жэння Еўрапейскага саюза, 9 мая штогод адзначаецца як Дзень Еўропы.

**1951**

*18 красавіка*

У Парыжы шэсць краін - Бельгія, Францыя, Федэратыўная Рэспубліка Германія, Італія, Люксембург і Нідэрланды - падпісваюць дагавор, які заснoўвае Еўрапейскае аб'яднанне вугалю і сталі (ЕАВС). Ён набывае моц 23 ліпеня 1952 года тэрмінам на 50 гадоў.

**1955**

*1-2 чэрвеня*

На сустрэчы ў Месіне міністры замежных спраў шасці краін прымаюць рашэнне перанесці працэс еўрапейскай інтэграцыі на эканоміку ўвогуле.

**1957**

*25 сакавіка*

У Рыме шэсць краін падпісваюць дагаворы аб стварэнні Еўрапейскай эканамічнай супольнасці (ЕЭС) і Еўрапейскай супольнасці па атамнай энергіі (Еўраатам). Яны набываюць моц 1 студзеня 1958 года.

**1960**

*4 студзеня*

На ініцыятыву Вялікабрытаніі Стакгольмская канвенцыя засноўвае Еўрапейскую асацыяцыю свабоднага гандлю (ЕАСГ), што аб'ядноўвае шэраг краін, якія не ўваходзяць у ЕЭС.

**1962**

*30 ліпеня*

Уводзіцца агульная палітыка ў галіне сельскай гаспадаркі.

**1963**

*14 студзеня*

Генерал дэ Голь абвяшчае на прэс-канферэнцыі, што Францыя накладзе вета на далучэнне Вялікабрытаніі да Еўрапейскіх супольнасцей.

*20 ліпеня*

Падпісанне ў Яундэ дагавора аб супрацоўніцтве паміж ЕЭС і 18 афрыканскімі краінамі.

**1965**

*8 красавіка*

Падпісанне дагавора аб зліцці выканаўчых органаў трох Супольнасцей і стварэнні адзіных Савета і Камісіі. Дагавор набывае моц 1 ліпеня 1967 года.

**1966**

*29 студзеня*

"Люксембургскі кампраміс". Пасля палітычнага крызісу Францыя выказвае згоду зноў удзельнічаць ў пасяджэннях Савета ў абмен на пагадненне пра тое, што будзе выконвацца прынцып аднадушнасці пры вырашэнні пытанняў, што закранаюць "жыццёва важныя нацыянальныя інтарэсы".

**1968**

*1 ліпеня*

Мытныя пошліны на прамысловыя тавары цалкам адменены за 18 месяцаў да сканчэння тэрміну, і ўведзены агульны вонкавы тарыф.

**1969**

*1-2 снежня*

На Гаагскім саміце палітычныя лідэры ЕЭС прымаюць рашэнне працягваць працэс еўрапейскай інтэграцыі.

**1970**

*22 красавіка*

У Люксембургу падпісаны дагавор, які дазваляе Еўрапейскім супольнасцям павялічваць фінансаванне за кошт уласных рэсурсаў і пашырае паўнамоцтвы Еўрапейскага парламента.

**1972**

*22 студзеня*

У Бруселі падпісаныя дагаворы аб далучэнні да Еўрапейскіх супольнасцей з Даніяй, Ірландыяй, Нарвегіяй і Вялікабрытаніяй.

*24 красавіка*
Шэсць дзяржаў ЕЭС прымаюць рашэнне пра тое, што курсы абмену іх валют не павінны вагацца болей чым на 2,25%. Гэтая сістэма вядомая пад назвай "валютная змяя".

**1973**
*1 студзеня*
Данія, Ірландыя і Вялікабрытанія далучаюцца да Еўрапейскіх супольнасцей, пасля чаго колькасць іх членаў дасягае дзевяці. Нарвегія адмаўляецца ад уступлення згодна з вынікамі рэферэндуму, на якім большасць насельніцтва прагаласавала супраць.

**1974**
*9-10 снежня*
На Парыжскім саміце палітычныя лідэры "дзевяткі" прымаюць рашэнне сустракацца тры разы на год у якасці Еўрапейскага савета. Яны таксама даюць згоду на прамыя выбары ў Еўрапейскі парламент і дамаўляюцца стварыць Еўрапейскі фонд рэгіянальнага развіцця.

**1975**
*28 лютага*
У Ламэ падпісаная І Ламэйская канвенцыя паміж ЕЭС і 46 краінамі Афрыканскага, Карыбскага і Ціхаакіянскага рэгіёнаў.

*22 ліпеня*
Падпісаны дагавор, які пашырае бюджэтныя паўнамоцтвы Еўрапейскага парламента і засноўвае Еўрапейскі суд аўдытараў. Ён набывае сілу 1 чэрвеня 1977 года.

**1978**
*6-7 ліпеня*
На Брэменскім саміце Францыя і Федэратыўная Рэспубліка Германія прапануюць адрадзіць валютнае супрацоўніцтва, заснаваўшы Еўрапейскую валютную сістэму (ЕВС) замест "валютнай змяі". ЕВС пачынае дзейнічаць 13 сакавіка 1979 года.

**1979**
*28 мая*
Еўрапейскія супольнасці падпісваюць дагавор аб далучэнні з Грэцыяй.

*7 і 10 чэрвеня*
Першыя прамыя выбары ў Еўрапейскі парламент, што мае 410 месцаў.

**1981**
*1 студзеня*
Грэцыя далучаецца да Еўрапейскіх супольнасцей, пасля чаго колькасць іх членаў дасягае дзесяці.

**1984**
*28 лютага*
Прынятая праграма "Эспрыт", скіраваная на актывізацыю навукова-даследчых распрацовак у галіне інфармацыйных тэхналогій.

*14 і 17 чэрвеня*
Другія прамыя выбары ў Еўрапейскі парламент.

**1985**
*7 студзеня*
Жак Дэлор становіцца старшынёй Еўрапейскай камісіі (1985-1995).

*12 чэрвеня*
Еўрапейскія супольнасці падпісваюць дагаворы аб далучэнні з Іспаніяй і Партугаліяй.

*2-4 снежня*
На пасяджэнні Еўрапейскага савета ў Люксембургу лідэры 10 дзяржаў-удзельніц дамаўляюцца перагледзець Рымскі дагавор і адрадзіць еўрапейскую інтэграцыю прыняццем Адзінага еўрапейскага акта. Гэта пракладае шлях да стварэння адзінага рынку да 1993 года.

**1986**
*1 студзеня*
Іспанія і Партугалія далучаюцца да Еўрапейскіх супольнасцей, пасля чаго колькасць іх членаў дасягае дванаццаці.

*17 і 28 лютага*
У Люксембургу і Гаазе падпісаны Адзіны еўрапейскі акт. Ён набывае моц 1 ліпеня 1987 года.

**1987**
*15 чэрвеня*
Пачатак ажыццяўлення праграмы "Эразмус", прынятай дзеля таго, каб дапамагчы маладым еўрапейцам навучацца за мяжой у іншых еўрапейскіх краінах.

**1989**
*15 і 18 чэрвеня*
Трэція прамыя выбары ў Еўрапейскі парламент.

*9 лістапада*
Разбурэнне Берлінскага муру.

*9 снежня*
У Страсбургу Еўрапейскі савет прымае рашэнне склікаць міжурадавую канферэнцыю ў пытаннях падрыхтоўкі эканамічнага і валютнага саюза (ЭВС) і палітычнага саюза.

**1990**
*19 чэрвеня*
Падпісанае Шэнгенскае пагадненне, якое скасоўвае памежны кантроль на межах паміж дзяржавамі - удзельніцамі Еўрапейскіх супольнасцей.
3 кастрычніка
Уз'яднанне Германіі.

*14 снежня*
Пачатак працы ў Рыме міжурадавай канферэнцыі ў пытаннях ЭВС і палітычнага саюза.

**1991**
*9-10 снежня*
Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Маастрыхце прымае Дагавор аб Еўрапейскім саюзе. Ён закладае падмурак агульнай вонкавай палітыкі і палітыкі ў галіне бяспекі, болей шчыльнага супрацоўніцтва ў сферы правасуддзя і ўнутраных спраў і стварэння эканамічнага і валютнага саюза, у тым ліку адзінай валюты. Міжурадавае супрацоўніцтва ў гэтых галінах, што дапаўняе існуючую сістэму Супольнасці, стварае Еўрапейскі саюз (ЕС). ЕЭС перайменаваная ў Еўрапейскую супольнасць.

**1992**
*7 лютага*
Дагавор аб Еўрапейскім саюзе падпісаны ў Маастрыхце. Ён набывае моц 1 лістапада 1993 года.

**1993**
*1 студзеня*
Стварэнне адзінага рынку.

**1994**
*9 і 12 чэрвеня*
Чацвертыя прамыя выбары ў Еўрапейскі парламент.

*24-25 чэрвеня*
На пасяджэнні Еўрапейскага савета ў Корфу ЕС падпісвае дагаворы аб далучэнні з Аўстрыяй, Фінляндыяй, Нарвегіяй і Швецыяй.

**1995**
*1 студзеня*
Аўстрыя, Фінляндыя і Швецыя далучаюцца да ЕС, пасля чаго колькасць яго членаў дасягае 15. Нарвегія адмаўляецца ад уступлення згодна з вынікамі рэферэндуму, на якім большасць насельніцтва прагаласавала супраць.

*23 студзеня*
Пачынае выкананне сваіх абавязкаў (1995-1999) новая Еўрапейская камісія пад старшынёўствам Жака Сантэра.

*27-28 лістапада*
Еўра-міжземнаморская канферэнцыя ў Барселоне ўсталёўвае партнёрскія стасункі паміж ЕС і краінамі паўднёвага ўзбярэжжа Міжземнага мора.

**1997**

*16-17 чэрвеня*

Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Амстэрдаме дасягае пагаднення наконт дагавора, што дае Еўрапейскаму саюзу новыя паўнамоцтвы і адказнасць.

*2 кастрычніка*

Падпісаны Амстэрдамскі дагавор. Ён набывае моц 1 мая 1999 года.

**1998**

*30 сакавіка*

Пачынаецца працэс далучэння новых краін-кандыдатак. У ім будуць удзельнічаць Кіпр, Мальта і 10 краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

*3 мая*

Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Бруселі прымае рашэнне аб тым, што 11 дзяржаў - членаў ЕС (Аўстрыя, Бельгія, Фінляндыя, Францыя, Германія, Ірландыя, Італія, Люксембург, Нідэрланды, Партугалія і Іспанія) адпавядаюць патрабаванням для ўвядзення адзінай валюты з 1 студзеня 1999 года. Грэцыя далучыцца пазней.

*31 снежня*

Устанаўліваюцца фіксаваныя і не падлеглыя адкліканню курсы абмену валют, што падлягаюць замене на еўра.

**1999**

*1 студзеня*

Пачатак трэцяга этапа ЭВС: валюты 11 краін ЕС замяняюцца на еўра. Адзіная валюта выпускаецца на валютныя рынкі. З гэтага моманту Еўрапейскі валютны банк (ЕВБ) нясе адказнасць за валютную палітыку ЕС, што ўстанаўліваецца і рэалізуецца ў еўра.

*24-25 сакавіка*

Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Берліне дасягае пагаднення аб асноўных прынцыпах бюджэту ЕС на 2000-2006 гады ў межах "Праграмы 2000".

*3-4 чэрвеня*

Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Кёльне прымае рашэнне звярнуцца з просьбай да Канвента падрыхтаваць праект Еўрапейскай хартыі фундаментальных правоў. Членамі Канвента з'яўляюцца прадстаўнікі кіраўнікоў дзяржаў або ўрадаў ЕС і старшыня Еўрапейскай камісіі.

Хаўер Салана прызначаны вярхоўным прадстаўніком ЕС у пытаннях агульнай вонкавай палітыкі і палітыкі бяспекі.

*8 і 13 чэрвеня*

Пятыя прамыя выбары ў Еўрапейскі парламент.

*15 верасня*

Пачынае выкананне сваіх абавязкаў (1999-2004) новая Еўрапейская камісія пад старшынёўствам Рамана Продзі.

*15-16 кастрычніка*

Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Тамперэ прымае рашэнне аб ператварэнні ЕС у зону свабоды, бяспекі і правасуддзя.

*10-11 снежня*

Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Хельсінкі, прысвечанае галоўным чынам пашырэнню ЕС, афіцыйна прызнае Турцыю кандыдаткай на ўступленне ў ЕС і прымае рашэнне актывізаваць перамовы з астатнімі 12 краінамі-кандыдаткамі.

**2000**

*23-24 сакавіка*

Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Лісабоне выпрацоўвае стратэгію заахвочвання занятасці ў ЕС, мадэрнізацыі эканомікі і ўмацавання сацыяльнай інтэграцыі ў высокатэхналагічнай Еўропе.

*7-8 снежня*

У Ніццы Еўрапейскі савет дасягае пагаднення наконт тэксту новага дагавора, што змяняе сістэму прымання рашэнняў у ЕС, каб падрыхтаваць саюз да пашырэння. Старшыні Еўра-

пейскага парламента, Еўрапейскага савета і Еўрапейскай камісіі ўрачыста абвяшчаюць Хартыю фундаментальных правоў ЕС.

**2001**

*26 лютага*

Падпісанне Ніццкага дагавора. Ён набывае моц 1 лютага 2003 года.

*14-15 снежня*

Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Лекене прымае дэкларацыю аб будучыні саюза. Яна адкрывае шлях да буйнога рэфармавання ЕС і заснавання Канвента ў пытанні падрыхтоўкі Еўрапейскай канстытуцыі. Старшынёй Канвента прызначаны Валеры Жыскар д'Эстэн.

**2002**

*1 студзеня*

У краінах зоны еўра паступаюць у абарачэнне банкноты і манеты еўра.

*31 мая*

Усе 15 дзяржаў ЕС адначасова ратыфікуюць Кіёцкі пратакол - сусветнае пагадненне аб зніжэнні выкіду газаў у атмасферу.

*21-22 чэрвеня*

Пасяджэнне Еўрапейскага савета ў Севільі дасягае пагаднення аб палітыцы ЕС у галіне прадастаўлення палітычнага прытулку і іміграцыі.

*13 снежня*

На пасяджэнні Еўрапейскага савета ў Капенгагене дасягнутая дамоўленасць пра тое, што 10 краін-кандыдатак (Кіпр, Чэшская Рэпубліка, Эстонія, Венгрыя, Латвія, Літва, Мальта, Польшча, Славакія і Славенія) могуць далучыцца да ЕС 1 мая 2004 года. Мяркуецца, што Балгарыя і Румынія далучацца ў 2007 годзе. Прынятае рашэнне аб тым, што перамовы з Турцыяй могуць пачацца, калі на падставе даклада і рэкамендацый Камісіі ў снежні 2004 года Еўрапейскі савет прыме рашэнне аб тым, што Турцыя выканала ўсе капенгагенскія крытэрыі.

**2003**

*16 красавіка*

У Афінах ЕС падпісвае дагаворы аб далучэнні з Кіпрам, Чэшскай Рэспублікай, Эстоніяй, Венгрыяй, Латвіяй, Літвой, Мальтай, Польшчай, Славакіяй і Славеніяй.

*10 ліпеня*

Канвент у пытанні будучыні Еўропы завяршае працу над праектам Еўрапейскай канстытуцыі.
4 кастрычніка
Пачатак працы міжурадавай канферэнцыі, якая павінна падрыхтаваць новы дагавор па Еўрапейскай канстытуцыі.

**2004**

*1 мая*

Кіпр, Чэшская Рэспубліка, Эстонія, Венгрыя, Латвія, Літва, Мальта, Польшча, Славакія і Славенія далучаюцца да Еўрапейскага саюза.

*10 і 13 чэрвеня*

Шостыя прамыя выбары ў Еўрапейскі парламент.

**2007**

Дата, вызначаная пасяджэннем Еўрапейскага савета ў Капенгагене (2002) для далучэння Балгарыі і Румыніі да ЕС.

**Іншая інфармацыя аб Еўрапейскім саюзе**

Інфармацыя на ўсіх афіцыйных мовах Еўрапейскага саюза маецца ў Інтэрнеце.
Доступ да яе ажыццяўляецца праз еўрапейскі сервер:
www.europa.eu.int

**Прадстаўніцтва Еўрапейскай Камісіі ва Украіне і Беларусі**

www.delblr.cec.eu.int

**Еўропа ў 12 уроках**
Серыя *"Еўрапейскія дакументы"*
Люксембург: Бюро афіцыйных публікацый Еўрапейскіх супольнасцей, 2004 г.
Пераклад зроблены з рускай мовы:
Европа в 12 уроках
Арыгінал-макет і вокладка: С.Лопатченко
64 стар.
Тыраж: 5000 асобнікаў
Падпісана да друку 12.01.2006
Друкарня ТОВ "Трiада"
© ПРАДСТАЎНІЦТВА ЕЎРАПЕЙСКАЙ КАМІСІІ ВА УКРАІНЕ І БЕЛАРУСІ